№ 1(31)/2000–2001

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, сьнежань 2000 — студзень 2001 г.




## МІНУЛА ХХ-Е СТАГОДДЗЕ

Мінула ХХ-е стагоддзе, скончылася 2-е тысячагоддзе і пачалося трэцяе. І мінула яно, і пачалося неяк незаўважна, без належнай увагі людзей, без падсумоўкі і раздумленьняў, без пакаяньняў і без надзей. Як быццам усе занятыя сваімі клопатамі, больш важнымі, чым задуменьне над вечнасьцю і сэнсам гісторыі.

У навагодні пераход стагоддзяў, гледзячы эўрапейскі тэлевізійны эфір, назіраючы калейдаскоп больш паўсотні нацыянальных праграмаў, нельга збавіцца ад ураженьня, што бачыш адну вялікую забаўляльную праграму шумнай духоўнай пустэчы, робленай весялосьці і агрэсіўнай бессаромнасьці. Моляцца ў Ватыкане, а вакол — мітусіцца Вальпургіева ноч Эўропы.

Гэта ў эфіры. І гэта адбітак часу, адлюстраваньне ўзроўню тых людзей, тых пластоў, што ўсплылі на паверхню культуры.

Чаму гэтак адбываецца — варта задумацца разам. Чалавек жывы ня можа ня думаць пра сэнс існаваньня. Але цяпер, на пераломе стагоддзяў, трэба азірнуцца ў глыбіню, каб убачыць, што было.

ХХ-е стагоддзе было стагоддзем тэхнічнага разьвіцьця. Кардынальна зьмянілася хуткасьць і ўзровень камунікацыяў між людзьмі і адпаведна — ўяўленьне пра прастору. Чалавек, сьведама ці нясьведама, стаў адчуваць сябе істотай не ў бясконцым нязьведаным сьвеце, як раней, а жыхаром на круглай зямлі ў замкнутай прасторы. Разьвіцьцё хуткасьці камунікацыяў пашырыла гарызонты, але абмежавала сьвет. Хуткасьць не дала эканоміі ў часе, але паскорыла рытм. Людзі сталі больш ведаць пра сьвет, але ці сталі яны лепшымі?

У сфэры грамадзкіх дачыненьняў XX-е стагоддзе запомнілася ў гісторыі як час крывавых сусьветных войнаў, масавага зьнішчэньня людзей, таталітарных ідэалёгіяў і асэнсаванай, знарочыстай, фантастычнай хлусьні.

Для нас, беларусаў, гэтыя сто гадоў былі драматычным выпрабаваньнем, поўным сьмерцяў і пакутаў. Тым ня менш, мінулае стагоддзе сталася для нас больш выніковым, чым XIX-е, калі ўсе нашыя паўстаньні і войны з Расеяй не далі выніку.

У XX-м стагоддзі была сьцьверджана Беларуская Нацыянальная Ідэя, адроджана Беларуская Дзяржава і аб'яўлена яе Незалежнасьць.

Сэнс гістарычнага існаваньня кожнага народу — у стварэньні нацыянальнай дзяржавы і разьвіцьці нацыянальнай культуры. Вось чаму для беларусаў найважнейшымі былі падзеі пачатку і канца XX-га стагоддзя. А менавіта: 1918 год, калі была створаная і аб'яўленая незалежнай Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), і 1991 год, калі была зьліквідаваная маскоўская ўлада КПСС і адноўленая незалежнасьць Беларусі.

Гэтыя падзеі ёсьць для нас найважнейшым вынікам XX-га стагоддзя, які ўдалося дасягнуць велізарнымі высілкамі, ахвярнасьцю, працай і ахвярамі прадстаўнікоў Беларускага нацыянальнага Адраджэньня.

Азіраючыся ўсьлед стагоддзю, зададзімся пытаньнем: чаго нам, беларусам, не хапіла, каб давесьці ўсё да канца? Шмат чаго нетавала, але найперш — не хапіла нам ***нацыянальнай салідарнасьці***.

Беларусы, асабліва перад аблічам чужых нашаму народу сілаў, павінны падтрымліваць адзін аднаго. Беларус беларусу мусіць спрыяць і шанаваць усё беларускае. Гэта абавязковая ўмова беларускай свабоды. Інакш нават геніяльныя справы вялікіх беларусаў будуць змарнаваныя, стануць ня чыньнікам перамогі, а толькі чарговай ахвярай на алтар нацыянальнага вызваленьня.

Вядома, што нельга здабыць свабоду без ахвяраў. Але свабода не дасягаецца толькі ахвярамі.

Дзень у дзень крочыць ужо па нашай зямлі XXI-е стагоддзе. Мы перайшлі ў яго з усімі нашымі турботамі, трывогамі і хваляваньнямі за наш лёс. Нашым людзям існуецца цяпер так цяжка, гэтак бедна і непрытульна, што беларусы ня могуць не задумвацца: а што чакае іх у будучыні. Шмат хто па звычцы спадзяецца, што нешта здарыцца, што нехта дапаможа, што неяк жа ж будзе. Але гэта памылковыя ўяўленьні. Бо ўсё залежыць не ад некага, а толькі ад нас, беларусаў, і толькі мы можам самы сабе дапамагчы, і толькі так будзе, як мы зробім.

Самае вялікае выпрабаваньне, якое ўжо нясе нам XXI-е стагоддзе, — і ня толькі нам, але і ўсёй Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе — гэта разбурэньне маралі і маральны рэгрэс. Д'ябальская атака брыдоты і паскудства ідзе на Беларусь з двух бакоў: з кагэбоўскай Расеі і зь лібэральнай Эўропы.

Гэта комплексная атака, але калі вылучыць галоўнае, то самай страшнай заганай, што ідзе з Усходу, гэта ёсьць алькагалізм, п'янства, стымуляванае ў нацыянальным маштабе.

На Беларусі п'янства рэзка пашырылася за апошнія 5-6 гадоў. У канцы XX-га стагоддзя на Беларусі, амаль у паўтары разы перавышаны дапушчальны парог спажываньня алькаголю на кожнага жыхара краіны, пасьля чаго пачынаецца незваротны працэс выраджэньня этнасу.

Для параўнаньня: у Беларусі спажываецца больш за 11 літраў алькаголю ў год на аднаго жыхара. У Расеі — 9 літраў, на Ўкраіне — 4,5 літра. Навуковая і міжнародна прынятая норма алькагольнага парогу, пасьля якога пачынаецца дэградацыя этнічнай супольнасьці, складае 8 літраў.

Да сярэдзіны 90-х адоў XX-га стагоддзя абсалютным чэмпіёнам па алькагольным спойваньні і выраджэньні была Расея. Тое, што здарылася зь Беларусьсю ў канцы XX-га стагоддзя і набірае моцы цяпер — гэта ёсьць этнічная і народная катастрофа. Патрэбныя ввельмі хуткія, радыкальныя і эфэктыўныя захады, разьлічаныя на доўгі час (адно-два пакаленьні), каб гэты працэс затармазіць.

Самай небясьпечнай заганай, што шчэміцца да нас з брусэльскай Эўропы, — гэта ўзаконьваньне чалавечай брыдоты на падставе фальшыва ўспрынятай лібэральнай канцэпцыі правоў чалавека. Ня можа быць свабоды граху. Чалавек ня мае права на разбэшчанасьць, на самазьнішчэньне (хоць і здольны гэта рабіць). Грамадзтва не павінна такое цярпець.

Дзе ж компас, дзе ж той справядлівы шлях, дзе зорка, якая павінна сьвяціць беларусам у XXI-м стагоддзі над дарогай, што вядзе ў Беларускі Храм?

Я мяркую, што ***Беларусь павінна вярнуцца да Хрысьціянства***. Беларусь у XXI-м стагоддзі мусіць адрадзіцца як Хрысьціянская краіна. Беларуская ідэя, абапертая на традыцыі беларускага Хрысьціянства — гэта шлях для нас найбольш унівэрсальны і правільны, бо толькі такая сьветлая і магутная ідэя магла б дапамагчы беларусам вылезьці з глыбокай ямы, у якую ўпіхнулі наш народ ворагі беларушчыны.

У нашай гісторыі ёсьць шмат дзівоснага і містычнага. Дзівосным было нашае ўстаньне з попелу ў канцы 80-х гадоў. Дзівосным было вяртаньне незалежнасьці ў 1991-м годзе вельмі малымі адраджэнцкімі сіламі ў Вярхоўным Савеце. Дзіўнымі здаюцца цяпер рабскія пакуты народа, структура інтэлектуальных магчымасьцяў якога ў чатыры разы перавышае сярэднеэўрапэйскі ўзровень. Дзіўным здаецца паніжэньне нашчадкаў тых, якія ніколі не прыгняталі іншыя народы і нават палонным іншаверцам давалі волю, зямлю і шляхецтва. Дзіўным ёсьць зьняважэньне народа, які трымае ў руках незвычайны сымвал — ***Бел-Чырвона-Белы Сьцяг Ісуса Хрыста***. Гэты сьцяг у рэальнасьці зьяўляецца галоўным зьместам варожага пераследу беларусаў і галоўным сэнсам беларускага змаганьня.

Магчыма, што Беларусь і яе народ чакае незвычайная будучыня і сьветлая доля. Магчыма, беларускім прарокам у XXI-м стагоддзі адкрыецца яе сэнс. Сёньня ж ужо відавочна і ўсім зразумела: ніколі беларускія рыцары Сьцяга ня выпусьцяць з рук наш сьвяты *Бел-Чырвона-Белы*, наш адвечны беларускі сымвал — *Сьцяг Беларускай Нацыі.*

***Зянон ПАЗЬНЯк***

*4-га студзеня 2001 г.*

# РЫЦАР БЕЛАРУСКАГА СЬЦЯГА

*(Подзьвігі Мірона)*

Легендарны Мірон ажыцьцявіў новы подзьвіг. *26 сьнежня* на другі дзень Нараджэньня Хрыстовага, апоўдні, ў вышыні над Віцебскам зьявіўся Мірон у барвовым плашчы. Ён узьняў беларускі *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* на 110-мэтровым коміне гарадзкой ТЭЦ. Укленчыўшы там, у гары, ён прачытаў „*Малітву за Беларусь" Рыгора Барадуліна*. Потым пакінуў традыцыйную цыдулку і зьнік.

У цыдулцы было напісана: „***Беларусь сустракае трэцяе тысячагоддзе пад Бел-Чырвона-Белым Сьцягам. З гэтым сімвалам мы выканаем запавет* Кастуся Каліноўскага*"***.

*Апрануўшыся ў барвовы плашч, Мірон паказаў усім, што ён ёсьць рыцарам Беларускага Сьцяга. Рыцар сьмелы і высакародны.*

Адвага і сьмеласьць Мірона ўражвае. Больш за 5 гадзінаў у марозны зімовы дзень ён знаходзіўся над горадам у ветранай вышыні. Ня толькі звышмерная цярплівасьць, але й вядомая „няўлоўнасьць" дапамаглі яму ў гэты раз. Унізе яго чакала пастка. Ён ледзь ня быў затрыманы. Але, дзякуючы беларускай кемлівасьці, усё прамінулася, ён здолеў застацца на волі й захаваць у таямніцы свой твар.

Потым у яго спыталі, як яму ўдалося вытрымаць гэтыя марозныя гадзіны. „*Мне дапамагала любоў да маёй сінявокай Беларусі. На гэтай вышыні я бачыў мой родны горад як на далоні. Я бачыў вуліцы, дамы, людзей, якія сьпяшалі на працу. Такі горад, як наш, і ўсю краіну трэба*

*бараніць. БО НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ — ГЭТА ЖЫЦЬЦЁ.”*

Сьцяг лунаў над Віцебскам цэлы дзень. Уладам зь цяжкасьцю ўдалося яго зьняць толькі позна вечарам, калі сьцямнела. Дасьціпны Мірон закруціў ланцугом і замкнуў на замок верхнюю пляцоўку на коміне і здымальнікі ніяк не маглі дабрацца да сьцяга. А калі яны паспрабавалі адамкнуць замок, то ў замочнай адтуліне таксама знайшлі цыдулку Мірона, дзе было напісана: „Заўсёды знойдзецца халуй, які захоча выслужыцца перад рэжымам”.

Потым журналісты стараліся дакапацца да падрабязнасьцяў подзьвігу. Дзеяньні Мірона былі навідавоку. Іх назірала шмат людзей. У тым ліку старшыня Віцебскай філіі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімер Плешчанка*** ў якасьці карэспандэнта *вольнай газэты „Выбар”*. Ахоўнікі, на момант страціўшы з поля зроку Мірона, першым чынам, па прывычцы, накінуліся на спадара *Плешчанку* (знаёмы бо). У гэты час Мірон бясьследна зьнік, растварыўшыся, нібы дым, у паветры.

Спадара *Плешчанку* тым часам пратрымалі ў пастарунку да 20-ці гадзінаў і потым адпусьцілі, патлумачыўшы, што нібы та пераблыталі яго зь іншым чалавекам, „які зьдзейсьніў злачынства”. СЛАВА МІРОНУ!




***Мірон у вышыні. 26 сьнежня 2000 г.***

***(Паводле SANA і матэрыялаў С. Радзько)***

# БЕЛАРУСКІ ЎРАД

Беларусы павінны мець беларускі ўрад. Урад, які існуе цяпер (той, што стварыў Лукашэнка), складаецца амаль выключна з расейцаў — функцыянэраў КГБ, генэралаў ды палкоўнікаў, што прыехалі з Расеі. Гэты небеларускі ўрад разбурае ўсё беларускае і на справе зьяўляецца акупацыйным урадам. Ён ня мае легітымнасьці, бо прызначаны незаконным прэзыдэнтам, які ўзурпаваў уладу неканстытуцыйным шляхам. Па факту ўзурпацыі ўлады Генэральным пракурорам Беларусі ***Рыгорам Пракаповічам*** узбуджана крымінальная справа, вядзецца сьледзтва.

* * *

Набліжаецца час прэзыдэнцкіх выбараў, якія спадар Лукашэнка намерваецца правесьці згодна сваіх выбарчых правілаў і недэмакратычных законаў. І тут востра паўстае пытаньне пра беларускі ўрад. Але разгледзім ўсё па парадку.

Лукашэнка ведае, што рэальная падтрымка ягонай асобы выбаршчыкамі зьнізілася да ўзроўню 15-ці адсоткаў. У такіх умовах, каб выйграць, ён можа толькі сфальсіфікаваць выбары, бо ягоны палітычны рэсурс скончыўся.

У тым, што спадар Лукашэнка пойдзе на такі антызаконны крок, — можна не сумнявацца. Найлепшы варыянт для яго — безальтэрнатыўныя выбары. (Гэта значыць — выбары з адным прэтэндэнтам.)

Можна прадбачыць таксама, што фальсіфікацыя будзе выкрыта, і міжнародная супольнасьць не прызнае выбары. Але прэзыдэнтам стане Лукашэнка, якога Эўропа потым прызнае *дэ факта.*

Якраз такая сітуацыя ўтварылася ў Казахстане: выбары не прызнаныя, а прэзыдэнтам застаўся Назарбаеў.

Сутнасьць у тым, што ў Казахстане не было рэальнай палітычнай альтэрнатывы. Калі няма альтэрнатывы, то тым, хто галасаваў супраць дыктатара, няма да каго апэляваць, няма каго супрацьстаўляць, няма свайго выбару, няма прычыны і фігуры, каб кансалідаваць барацьбу і прад’явіць канструктыўныя прэтэнзіі фальсіфікатару.

Што датычыць міжнароднай супольнасьці (асабліва на ўзроўні парляментаў і ўрадаў), то пры адсутнасьці альтэрнатывы ёй увогуле ня будзе на што абаперціся, каб весьці нейкую абгрунтаваную палітыку непрызнаньня дыктатуры.

Трэба чакаць, што Лукашэнка захоча скарыстаць гэты зручны для сябе безальтэрнатыўны варыянт, бо выхаду ў яго няма: альбо пан, альбо прапаў.

Ня выключаная таксама іншая сітуацыя, калі, дзеля ўдаваньня „дэмакратычнасьці” і ўвядзеньня ў зман грамадзтва, будзе зарэгістраваны шэраг падстаўных, бясколерных, амбіцыйных, але беспэрспэктыўных кандыдатаў, якія, вядома ж, прайграюць „у чэснай барбе” і забясьпечаць фармальную легітымнасьць выбараў Лукашэнкі.

Менавіта такой нядобрай справай (намерам удзельнічаць у лукашэнкаўскім сцэнары) займаецца цяпер так званая „аб’яднаная апазыцыя”, падыгрываючы, фактычна, інтарэсам рэжыму.

Адзначым таксама, што ***ініцыятыва выбараў, усе рычагі і сцэнар выбарчай кампаніі цалкам знаходзяцца ў руках Лукашэнкі***.

Што трэба рабіць у такім становішчы? Перш за ўсё — ***неабходна стварыць легальную альтэрнатыву рэжыму***. Такой альтэрнатывай можа стаць законны беларускі ўрад.

Ёсьць усе законныя падставы, фармальныя ўмовы і аб’ектыўная неабходнасьць, каб стварыць урад. Згодна Канстытуцыі, Старшыня Вярхоўнага Савету Сымон Шарэцкі ў любы момант можа афіцыйна ўзяць на сябе функцыі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, прапанаваць прэм’ера ўраду і галоўных палітычных міністраў, якіх зацьвярджае Вярхоўны Савет. Калі такім чынам будзе створаны законны ўрад Рэспублікі Беларусь, сітуацыя рэзка зьменіцца на карысьць Беларусі.

Уявім, што Лукашэнка фальсіфікуе і выйграе выбары. Міжнародная супольнасьць не прызнае такія выбары. Але тым часам яна ня можа не прызнаць законны ўрад, створаны прызнанымі канстытуцыйнымі органамі. Беларускі ўрад можа стаць легальнай апорай для міжнароднай супольнасьці ў яе падтрымцы правоў чалавека, законнасьці і справядлівасьці ў Беларусі.

Калі будзе ўрад, выбаршчыкі, якія не галасавалі за Лукашэнку, атрымліваюць законны цэнтар кансалідацыі супраць рэжыму. Грамадзтва пазьбягае роспачы і тупіку, бо ў яго будзе альтэрнатыва змаганьня з рэжымам, абгрунтаваная законам. Беларус, які стане змагацца з дыктатурай, абапіраючыся на Беларускі ўрад, будзе ўсьведамляць законнасьць сваіх дзеяньняў.

Дзяржаўны чыноўнік, начальнік ці генэрал, ня могуць выконваць указаньні якой бы там ні было палітычнай партыі. Тым часам яны мусяць будуць рабіць выбар паміж рэжымам і законным урадам. Трэба даць такі выбар.

Калі будзе дзейнічаць законны беларускі ўрад, тады фальшывая перамога Лукашэнкі на выбарах не дасьць яму доўга пратрымацца. Лукашэнка сябе вычарпаў. Гэта скончаны палітык. Сем гадоў ён разбураў усё беларускае і тахціў Беларусь у яму. Пры Лукашэнку ўсім беларусам стала горай. Ён ужо нічога ня можа рэальна абяцаць і тым больш — зрабіць.

Небясьпечны аднак новы варыянт. Гэта калі Масква знойдзе іншую сваю кандыдатуру замест Лукашэнкі і падставіць яе на выбары пад шапкай „дэмакрата" ці пад выглядам кампраміснай фігуры, быццам бы прыймальнай для ўсіх.

***Калі б новы маскоўскі стаўленьнік заняў пасаду прэзыдэнта Беларусі і калі б не засталося яму ніякага палітычнага супрацьпастаўленьня, то гэта было б найгорш.*** Грамадзтва сталася б дэзарыентаваным і ашуканым. Новы стаўленьнік Масквы, спарадзіўшы ілюзорныя надзеі, пратрымаўся б даўжэй і так бы разбурыў Беларусь, што яна магла б не падняцца.

У такім становішчы і пры такім вырыянце існаваньне законнага Беларускага ўраду давала б надзею і паказвала б законны шлях барацьбы.

Пытаньне аб стварэньні законнага Беларускага ўраду стаіць даўно. Перад Новым Годам Старшыня Вярхоўнага Савету Сымон Шарэцкі выступіў з адмысловай заявай, дзе абгрунтаваў неабходнасьць ураду. Яго арганізацыя залежыць ад Старшыні і дэпутатаў Вярхоўнага Савету.

Але далёка ня ўсе дэпутаты разумеюць задачу. Прычына ўсё тая ж — глыбокая дэзынтэграцыя беларускага грамадзтва.

Каб вырашаць агульнадзяржаўныя задачы, трэба трымаць у душы агульнанацыянальныя інтарэсы. ***Палітычны і сьветапоглядны падзел людзей не павінен уплываць на іхняе адзінства ў абароне нацыянальных інтарэсаў.***

Слабасьць беларускай палітычнай эліты якраз у адсутнасьці разуменьня і ўспрыняцьця гэтай пазыцыі. Прадметам спрэчак, гандлю і палітычнай барацьбы сталі недыскусійныя каштоўнасьці — ад суверэнітэту да нацыянальнай мовы, ад незалежнасьці да нацыянальнай сымболікі. Такі стан думак — вынік двухсотгадовага каляніялізму, гвалту над асобай, ідэалягічнага чаду расейскай акупацыйнай палітыкі.

Трэба сказаць праўду: малаверагодна, каб за кароткі час зьмяніліся паняцьці ў людзей, і законны Беларускі ўрад быў бы створаны. (Хоць дзеля гэтага варта зрабіць толькі крок.)

Ня выставіць на выбарах ніякай альтэрнатывы супраць імпэрскай палітыкі Масквы і так званая „аб'яднаная апазыцыя", бо сама яна не зьяўляецца такой альтэрнатывай. Яна ня мае нацыянальнай ідэі змаганьня і адпаведна — ня мае рэальнага прэтэндэнта. Яна залежная ад зьнешніх рэсурсаў, і ўсе яе квазі-кандыдаты клапоцяцца пра падтрымку Масквы. Брыдка гэта ўсё выглядае.

***Альтэрнатывай рэжыму акупацыі і вялікадзяржаўнай палітыцы Расеі зьяўляецца на Беларусі, як і дзесяць, і сто гадоў таму — Нацыянальна-Вызвольны Рух беларускага Адраджэньня.***

У сітуацыі, якая складваецца (калі беларускага ўраду ня будзе), Вызвольны Рух мусіць удзельнічаць у выбарах прэзыдэнта і вылучыць кандыдата, але (разумеючы паводзіны Лукашэнкі) ня дзеля таго, каб гуляць у ягоныя гульні, а ***дзеля змагарнай альтэрнатывы і палітычнае барацьбы за вольную Беларусь***.

Я мяркую аднак, што пытаньне з стварэньнем законнага беларускага ўраду можа ўзьнікнуць яшчэ не аднойчы. Ня выключана, на жаль, — што па часе (як гэта водзіцца часта ў беларусаў). А шкада: своечасовае стварэньне беларускага ўраду магло б стаць чыньнікам разгромнай паразы дыктатара на выбарах, паспрыяць ліквідацыі ўсёй шавіністычнай маскоўскай палітыкі на Беларусі.

Аналіз бальшыні страчаных беларусамі шансаў за апошнія 8-9 гадоў паказвае, што страты ды здрада адбываліся толькі таму, што справа залежала ад людзей, далёкіх ад нацыянальных задачаў беларускага Адраджэньня.

Беларусы павінны зрабіць з гэтага высновы і не спадзявацца на палавіністых палітыкаў.

Беларускае грамадзтва стаіць на парозе вызначальных пераменаў. Сэнс жа ў тым, каб з пераменаў скарысталіся не Лукашэнка, не Масква, не „дэмакратычная апазыцыя", а Беларускі народ.

*Зянон ПАЗЬНЯК*

*2 лютага 2001 г.*

# МУСІЦЬ БЫЦЬ БЕЛАРУСКІ ЎРАД!

*(Заява)*

Мы адзначаем, што адбываецца ўзмацненьне маскоўскай акупацыйнай палітыкі на Беларусі і актывізацыя спэцслужбаў чужой дзяржавы. Гэта выяўляецца ў чарговых этнічных чыстках у сістэме структураў улады, зь якіх выдаляюцца асобы беларускай нацыянальнасьці і беларускага паходжаньня. На іхняе месца ставяцца генэралы і палкоўнікі расейскіх спэцслужбаў КГБ-ФСБ, рускія выхадцы з Расеі. На сёньняшні дзень у дзеючым урадзе і ў вышэйшых структурах улады не засталося, практычна, ніводнага беларуса.

Улада на Беларусі ўжо знаходзіцца ў руках рускіх спэцслужбаў. Акупацыя беларускай дзяржаўнай улады расейцамі адбылася знутры праз поўны кантроль Масквы над Лукашэнкам. Гэтая акупацыйная ўлада актыўна праводзіць на Беларусі імпэрскую палітыку ва ўсіх сфэрах жыцьця. Поўнасьцю ўзятыя пад расейскі кантроль і мэтанакіравана разбураюцца беларуская эканоміка, беларуская культура, беларуская адукацыя.

Цяпер расейцы любым спосабам намагаюцца легалізаваць (легітымізаваць) сваю ўладу на Беларусі, каб фармальна-праўным чынам зацьвердзіць акупацыю і потым — захоп беларускай маёмасьці і ліквідацыю Беларускай дзяржавы.

Легалізацыю акупацыйнай улады на Беларусі Масква хоча праводзіць праз прэзыдэнцкія выбары, ажыцьцяўляючы (як і ў 1994 годзе) адразу два варыянты: стаўку на Лукашэнку і стаўку на яго суперніка, падабранага Масквою. Канчатковы варыянт праявіцца ў працэсе выбараў.

Вынік прэзыдэнцкіх выбараў на Беларусі можа абазначаць для Масквы альбо захоп, альбо страту Беларусі. Вынік выбараў для Лукашэнкі — гэта пытаньне лёсу і жыцьця: быць альбо ня быць. Таму ніякіх дэмакратычных і ўвогуле — нармальных выбараў акупацыйны рэжым у Беларусі не дапусьціць. Тым больш, што беларускае грамадзтва ўжо не падтрымлівае Лукашэнку.

Плянуюцца ня выбары, а выбарчая прафанацыя (жорсткая і нахабная) і фальсіфікацыя галасаваньня.

Пры арганізацыі запаснога варыянту на выбарах (альтэрнатывы Лукашэнку) Масква намерваецца выкарыстаць правераных асобаў з так званай „аб'яднанай апазыцыі", здрадніцкая сутнасьць якой ужо даўно раскрыта Беларускім Вызвольным Рухам.

У гэтым становішчы ***беларусы павінны ствараць сваю беларускую альтэрнатыву акупацыйнай уладзе і акупацыйнай палітыцы. Неабходна неадкладна стварыць законны Беларускі ўрад***. Цяпер яшчэ ёсьць магчымасьць. Беларусы мусяць мець сваю вышэйшую выканаўчую ўладу, якая будзе кіраваць змаганьнем з акупацыйным рэжымам.

Мы патрабуем ад дэпутатаў Вярхоўнага Савета 13-га скліканьня

неадкладна падтрымаць ініцыятыву Сымона Шарэцкага пра стварэньне законнага ўраду, прыняць і зацьвердзіць ягоныя прапановы па складзе ўраду.

Бяздзейнасьць дэпутатаў Вярхоўнага Савету ў гэтакіх абставінах недапушчальная. Мы зьвяртаемся да выбаршчыкаў выбарчых акругаў з прапановай арганізаваць сходы і запатрабаваць справаздачы ад дэпутатаў Вярхоўнага Савета за 5 гадоў працы. Падрыхтаваць наказы і меркаваньні пра іхныя канстытуцыйныя абавязкі.

Беларускі Вызвольны Рух і яго галоўныя арганізацыі (Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ і Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”), якія выяўляюць інтарэсы Беларускага Народа і спаўняюць патрэбы Беларускай Нацыі, гатовыя падтрымаць стварэньне законнага Беларускага ўраду.

У адпаведнасьці з Канстытуцыяй і ўлічваючы трансфармацыю паняцьця кворуму ў існуючых абставінах, шмат што залежыць ад дзеяньняў Старшыні Вярхоўнага Савета і ад яго актыўнасьці. Мы заклікаем яго праявіць цьвёрдасьць і рашучасьць у дасягненьні мэты.

Беларусь у небясьпецы. ***Мы заклікаем усіх беларусаў стаць на абарону Беларусі, згуртавацца вакол Беларускага Вызвольнага Руху і патрыётаў Бацькаўшчыны. Беларусы мусяць адваяваць сваю волю, зьберагчы сваю дзяржаву і незалежнасьць.***

*Прынята Соймам Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”*
*і Соймам Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*
*9 сьнежня 2000 г.*

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***
***Юры БЕЛЕНЬКІ***
***Выконваючы абавязкі Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***
***Анатоль КРЫВАРОТ***
***Адказны сакратар Ўправы Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

# ЗВЫЧАЙНАЯ ЗДРАДА

*Чарцей не схаваеш — альбо асьлiныя вушы, альбо рогi тырчаць.*

Гісторыя посткамунізму ўжо паказала, што апазыцыя, якая змагаецца з рэжымам за грошы, калі прыходзіць да ўлады — пачынае красьці больш за папярэднікаў. Такія лёсам народу не цікавяцца.

У беларускай так званай „аб’яднанай апазыцыі” на паверхні былыя сябры і хаўрусьнікі Лукашэнкі. Ім усім хочацца стаць прэзыдэнтамі і таму яны адзін за другім езьдзяць у Маскву шукаць падтрымкі. Яны імкнуцца пераканаць маскоўцаў, што будуць лепшымі за Лукашэнку (для Масквы, вядома).

„Мы понимаем, что в наших руках судьба Беларуси”, *— кажа (і, відаць, думае) адзін такі „апазыцыянэр” **Міхаіл Чыгір**.

Тады яму задаюць пытаньне:

*— Как сообщила недавно российская газета „Сегодня”, в Беларуси в прошлом году работали несколько аналитических групп, которые изучали у нас политическую ситуацию. Знаете ли вы об этом?*

— Конечно, знаю. Более того, я встречался с одним из представителей этих групп. Хочу добавить, что в отличие от времен Бориса Николаевича Ельцина, когда основным источником информации в Росии о Беларуси были только официальные каналы — президент, правительство, МИД, то нынешняя путинская администрация создала у нас в стране, насколько я знаю, три независимые и автономные группы: одна представляет Совет безопасности, другая — Администрацию президента, третья — ФСБ. Они отслеживают ситуацию в Республике Беларусь и дают сейчас свои предложения, свои замечания президенту России.

*— Известны ли Вам какие-нибудь результаты наблюдений российских груп?*

— Насколько мне известно, россияне будут наблюдать за происходящим в Беларуси еще достаточно длительное время и по своей позиции касательно поддержки того или иного кандидата на президентских выборах определятся гораздо позже. И то, что российская сторона собирает информацию не только по официальным каналам, но и неофициальным, — своеобразное ноу-хау нового российского руководства. Как мне сообщили, эти люди „узнали много нового и интересного о Беларуси”.**

Калі я гэта прачытаў, *** то не паверыў вачам сваім. Але факт ёсьць факт. Чыгір адкрыта расказвае пра свае сувязі і кантакты з расейскімі спэцслужбамі. Я паказаў гэты матэрыял Генэральнаму Пракурору Беларусі спадару Рыгору Пракаповічу. Выглядае так, што калі пачнецца працэс па факту ўзурпацыі ўлады ў Беларусі, то так званая „апазыцыя” будзе праходзіць ня толькі ў якасьці сьведкаў па справе ды абвінаваўцаў. Урэшце рэшт людзі разьбяруцца, як і з Лукашэнкам. Толькі лепш разабрацца перад, чым пасьля. Меншыя страты для грамадзтва.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

---

* Мы разумеем, што ў нашых руках лёс Беларусі (з руск.)

** *— Як паведаміла нядаўна расейская газэта „Сегодня”, у Беларусі ў мінулым годзе працавалі некалькі аналітычных групаў, якія вывучалі ў нас палітычную сітуацыю. Ці ведаеце вы пра гэта?*

— Вядома, ведаю. Больш таго, я сустракаўся з адным з прадстаўнікоў гэтых групаў. Хачу дадаць, што ў адрозьненьне ад пэрыяду Барыса Мікалаевіча Ельцына, калі асноўнымі крыніцамі інфармацыі ў Расеі пра Беларусь былі толькі афіцыйныя каналы — прэзыдэнт, урад, МЗС, — то цяперашняя пуцінская адміністрацыя стварыла ў нас у краіне, наколькі я ведаю, тры незалежныя і аўтаномныя групы: адна прадстаўляе Савет бясьпекі, другая — адміністрацыю прэзыдэнта, трэцьцяя — ФСБ. Яны адсочваюць сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь і даюць цяпер свае прапановы, свае заўвагі прэзыдэнту Расеі.

*— Ці вядомыя Вам якія-небудзь вынікі назіраньняў расейскіх групаў?*

— Наколькі мне вядома, расейцы будуць назіраць за тым, што адбываецца ў Беларусі, яшчэ дастаткова доўгі час і па сваёй пазыцыі, што датычыць падтрымкі таго ці іншага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах, вызначацца значна пазьней. І тое, што расейскі бок зьбірае інфармацыю ня толькі па афіцыйных каналах, але і па неафіцыйных, — гэта своеасаблівае ноў-хаў новага расейскага кіраўніцтва. Як мне паведамілі, гэтыя людзі „даведаліся шмат новага і цікавага пра Беларусь.” (з руск.)

*** „Народная Воля”, — 2001, 18 студзеня.

# АБ ПАЛІТЫЧНЫМ МОМАНЦЕ

*(Паведамленьне)*

15-га Кастрычніка Лукашэнка прайграў выбары ў „палату”. Фальсіфікацыя выбараў ужо яго не ўратуе. Усе ведаюць, што людзі ў большасьці не прыйшлі галасаваць. Гэта сьведчыць, што няма больш падтрымкі ўзурпатару. Лукашэнка павінен пакінуць пасаду, якую займае незаконна. „ЛУКАШЭНКА, ЗЫХОДЗЬ!” — вось патрабаваньне, якое мусяць прад’явіць беларусы. Законныя выбары павінны правесьці законныя органы ўлады.

Лукашэнка хоча ўратавацца і правесьці прэзыдэнцкія выбары па сваіх нелегальных законах і правілах. Масква думае пра магчымасьці замяніць Лукашэнку на іншага свайго стаўленьніка пад выглядам дэмакрата, а нямецкая дыпляматыя (ў асобе Ганса-Георга Віка) і лібэралы з Эўразьвязу падтрымліваюць гэтакую палітыку і выкарыстоўваюць у гэтым так званую „аб’яднаную апазыцыю”, якой кіруюць былыя хаўрусьнікі Лукашэнкі.

Варыянт замены Лукашэнкі на іншага маскоўскага стаўленьніка пад выглядам апазыцыйнага дэмакрата яшчэ горшы, чым цяперашні. Тады беларускае грамадзтва будзе абяззброенае і дэзыарыентаванае, а

Беларусь здадуць пад Расею хутчэй, чым з цяперашнім амбіцыйным начальнікам улады.

У сувязі з гэтым:

— *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* пацьвярджаюць, што выстаўляць адзінага кандыдата ад *Вызвольнага Руху і ўсёй Вольнай Беларусі;*

— *Беларускі Вызвольны Рух* разглядае рэжым Лукашэнкі і яго „аб'яднаную апазыцыю" як зьявы аднае прыроды, якія йдуць у рэчышчы агульнай нямецка-расейскай палітыкі на Беларусі. *Беларускі Вызвольны Рух* змагаецца супраць гэтай палітыкі;

— *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* зьвяртаюцца да беларусаў, каб не выказвалі ніякай падтрымкі Лукашэнку і асобам так званай „аб'яднанай апазыцыі".

Сьпее чарговая нацыянальная здрада. Гэтая „аб'яднаная апазыцыя" існуе на грошы чужых краінаў і выконвае іхную палітыку. Гэтыя людзі (М.Чыгір, А.Лябедзька, Д.Булахаў, Л.Сініцын, А.Фядута і інш.) ужо адзін раз зрабілі шкоду Беларусі і дапамаглі прыйсьці да ўлады Лукашэнку. Цяпер яны хочуць вярнуцца ва ўладу на сьпіне даверлівага беларускага народа зноў, пры дапамозе Масквы, нямецкіх дыпляматаў і лібэральных палітыкаў з Эўразьвязу, якіх не цікавіць пагроза незалежнасьці Беларусі з боку Расеі, але абходзяць свае інтарэсы ва Ўсходняй Эўропе.

Беларусы ня мусяць абыякава адносіцца і цярпець чужую антыбеларускую палітыку.

*Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ лічаць нямецкага дыплямата* **Ганса-Георга Віка** *(які засьведчыў сваю антыбеларускую дзейнасьць) пэрсонай нон-грата і прапануюць яму дабраахвотна пакінуць нашу краіну.*

***Прынята Соймам Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і Соймам Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***

*18 лістапада 2000 г.*

## ЦЭНТРАЛЬНА-УСХОДНЯЯ ЭЎРОПА МАЕ СВАЕ ІНТАРЭСЫ

Адносна нямецка-расейскай антыбеларускай палітыкі мы павінны памятаць, што гэтая палітыка ўзьнікла ня сёньня і ня ўчора, а даўно. Яна прывяла да ліквідацыі Рэчы Паспалітай і нашай свабоды, да паняволеньня народаў Усходняй Эўропы, выклікала І-ю і ІІ-ю Сусьветныя войны і працягваецца вось ужо трэцяе стагоддзе. Ня цяжка пралічыць, да чаго яна можа прывесьці.

Свабода Беларусі залежыць не ад добрых стасункаў з Расеяй і Нямеччынай (іх ня будзе, пакуль існуе Расея), а ад самых беларусаў і ад існаваньня незалежнай Украіны, Польшчы і Летувы, ды добрых дачыненьняў з гэтымі суседзямі. Гэтак сама незалежнасьць Украіны залежыць ад існаваньня вольнай Польшчы, Беларусі і Летувы, а незалежнасьць Польшчы — ад вольнай Украіны, Летувы і Беларусі. Тут ўзаемасувязь.

Для нас — народаў-суседзяў — гэта „алфавіт", правіла, пацьверджанае гісторыяй, якое мы мусім ведаць напамяць. Гэта рэальнасьць, якую мы сузіраем. Калі мы хочам вольна, незалежна й добра існаваць у сьвеце, то ўсе мы ва Ўсходняй Эўропе павінны трымацца салідарна, разам, падтрымліваць адзін аднаго. Гісторыя і рэчаіснасьць пацьвярджаюць, што Захад ёсьць Захад, Усход ёсьць Усход, а мы — ёсьць мы.

Нямецка-расейская палітыка вядзе да таго, каб у пэрспэктыве немцы маглі расправіцца з Польшчай у „аб'яднанай Эўропе", а расейцы — зь беларусамі, украінцамі і летувісамі ў аднаўленай Расеі.

Над усёй гэтай тайнай і яўнай палітыкай чадзіць дым дэмагогіі пра дэмакратыю і правы чалавека. У той час, калі добра відаць, што ўсю гэтую дэмакратыю яны, не задумваючыся, здаюць за нейкую лядашчую трубу (ня кажучы ўжо пра „чалавекаў").

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***(З выступу на сьнежаньскім Сойме БНФ)***

## БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІЯ ЎРАЧЫСТАСЬЦІ Ў КРАКАВЕ

*16 лістапада ў Кракаве на Ракавецкіх могілках* ля магілы ***Аляксандра Прушынскага (Алеся Гаруна — паэта і Міністра вайсковых справаў Беларусі ў 1919 г.)*** і перад помнікам украінскім салдатам атамана ***Пятлюры*** была адзначана *80-я гадавіна ўтварэньня Нацыянальнага ўраду БНР пад кіраўніцтвам Вячаслава Адамовіча (16.ХІ.1920).* Урачыстасьць арганізавалі прадстаўнікі *Камітэту Польшча-Беларусь імя генэрала Станіслава Булак-Балаховіча, Агульнапольскага Камітэту Нацыянальнай Памяці, Камісіі па Супрацоўніцтву Руху Адбудовы Польшчы* і *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне".*

Былі запаленыя зьнічы, узьнятыя беларускія сьцягі (нацыянальны і сьцяг БНФ), гучэлі прамовы.

Па поўдні ў залі *Камітэту Польшча-Беларусь* адбылося спатканьне *Зянона Пазьняка* і *Валеры Буйвала* з палітычнай грамадзкасьцю і моладдзю Кракава. Беларускія госьці Кракава расказалі пра сучаснае палітычнае становішча ў Беларусі і адказалі на шматлікія пытаньні.

У заяве *Камітэту Польшча-Беларусь* з нагоды гістарычнай падзеі сказана наступнае: *„У лістападзе 1920 г. генэрал Станіслаў Булак-Балаховіч пачаў барацьбу за суверэнную Беларусь. Разам зь ім выступіў Расейскі Палітычны Камітэт Барыса Савінкова — была гэта таксама барацьба за дэмакратычную, незалежную Расею.*

*Сёньня лёзунгі і штандары, пад якімі выступіў генэрал Булак-Балаховіч, зноў актуальныя. Рэспубліка Беларусь пад нелегальным кіраўніцтвам агента КГБ траціць сваю дзяржаўнасьць; Расея пад кіраўніцтвам палкоўніка КГБ вяртаецца на рэйкі імпэрскай палітыкі. У Чачэніі прадаўжаецца расейскае людабойства!"*

Было прынятае рашэньне аб правядзеньні 23 лютага 2001 г. у краінах Эўропы і Амэрыкі сумесных беларуска-польска-чачэнскіх акцыяў пад лёзунгам: „НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ ЧАЧЭНІІ, СВАБОДУ БЕЛАРУСІ!"

***Ф.ГРАЖЫНОВІЧ***

## НАПАД НА БЕЛАРУСКАГА ДЗЕЯЧА МАСТАЦТВА

*20 студзеня ў Менску* позна вечарам быў напад на вядомага беларускага тэатральнага рэжысёра ***Валеры Мазынскага***. Выглядае нават, што плянавалася „непрадбачанае забойства". Нехта падышоў да В.Мазынскага з-за сьпіны на вуліцы ў цемнаце і пачаў біць рэжысёра цяжкім прадметам па галаве, а потым, зрабіўшы чорную справу, ціха адышоў. Валеры Мазынскі ў цяжкім стане трапіў у рэанімацыю.

Забойствы і расправы з дзеячамі мастацтва і культуры — тыповы почырк расейскага НКВД. Тут праглядваецца пэўная паранойя. Звычайна нападаюць на дзеячоў мастацтва і культуры, якія чымсьці балюча зачапілі дыктатара: ці таленавітым фільмам, ці публіцыстыкай, ці спэктаклем, ці нават вершам. Для прарасейскага



*Кракаў. 16 лістапада. Запальваньне зьнічаў на магіле Алеся Гаруна.*



*Кракаў. 3-га ліпеня 2000 г. Дэманстрацыя Камітэту „Польшча-Беларусь” перад консулятам ЗША, супраць расейскай імпэрскай палітыкі ў Беларусі і Чачэніі. Патрабаваньні спыніць дапамогу Амэрыкі для Расеі.*

рэжыму беларуская культура ёсьць першы вораг. Бо ў грунце справы — рэжым ваюе супраць беларускай нацыі.

***Пётра ЯНОВІЧ***



*Магіла Алеся Гаруна на Ракавіцкіх могілках у Кракаве.*

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

***(Інфармацыйная камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ.***
*Па матэрыялах Камісіі, СМІ, Вясны-96”, SANA)*

## *КАСТРЫЧНІК (2000 год)*

*1 кастрычніка* „аб’яднаная апазыцыя” зрабіла шэсьце пад назвай „Марш Свабоды”. Калёна бесперашкодна прайшла ад Акадэміі Навук, вул. Сурганава да парку Дружбы народаў, побач з плошчай Бангалёр на былое балота, дзе прайшоў кароткі мітынг.

Ю.Сьвірко: „13.05. Я бачу каля 5 тысячаў удзельнікаў. Сьцягі.., беларускія песьні. Спакойна. Палкоўнік Саланец вядзе прыяцельскія размовы з журналістамі „Народнай Волі”. Ён паведаміў: „Паводле афіцыйных зьвестак, колькасьць удзельнікаў зараз — каля 3-х тысячаў”.

*2 кастрычніка.* У судзе Першамайскага раёну Менска спадару ***Сяргею Шынкевічу*** за арганізацыю сустрэчы з выбаршчыкамі (якая

была прызнаная судом за несанкцыянаваны пікет) прысуджаны штраф у памеры 150 мінімальных заробкаў. Суддзя **Ю**. **Гарбатоўскі**.

*2 кастрычніка* да ***Станіслава Шушкевіча*** прыехалі міліцыянты, каб уручыць яму позву зьявіцца ў якасьці сьведкі ў суд Савецкага раёну. Пасьля таго, як позву ніхто ня ўзяў, быў прысланы міліцыянт, узброены аўтаматам, які заняў пазіцыю каля дзьвярэй кватэры С.Шушкевіча. Паводле сьведчаньня жонкі С.Шушкевіча, аўтаматчык знаходзіўся ў пад'езьдзе працяглы час.

*2 кастрычніка, Віцебск.* Зноў забралі ў пастарунак ***Барыса Хамайду*** ды іншых сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.* Яны штодня выходзілі на пікеты, каб патлумачыць віцеблянам сьвядомы няўдзел Партыі ў будучых выбарах. Увесь мінулы тыдзень яны законна карысталіся магчымасьцю перадвыбарчай агітацыі, але 2-га кастрычніка міліцэйскае начальства дало загад затрымаць пікетоўцаў і даставіць у Чыгуначны РАУС Віцебску. (Гэта 5-е затрыманьне за 2 мінулыя тыдні.)

*3-4 кастрычніка. У Віцебску* пачаліся судовыя працэсы над сябрамі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* **Барысам Хамайдам**, ***Уладзімерам Плешчанкам***, ***Зьміцерам Піменавым***. Ад пачатку агітацыйнай перадвыбарчай кампаніі на рахунку гэтых людзей ажно 9 затрыманьняў. У пратаколах затрыманьняў фігуруе абвінавачваньне ў арганізацыі несанкцыянаваных пікетаў, у агітацыі за байкот выбараў. Падчас судовых працэсаў суддзя **Сьвятлана Туфан** выклікала сьведкаў падзеяў ды міліцыянтаў, якія іх затрымлівалі. Толькі 2-е міліцыянтаў (**Шайдулаеў**, **Муртызаеў**) пацьвердзілі, што былі сьведкамі агітацыі за байкот. Абодва не разумеюць беларускае мовы, затое абдва (не па загадзе начальства, а па ўласнай ініцыятыве) прынялі ўдзел у затрыманьні апазыцыянэраў. Суд перанесены.

*5 кастрычніка* з Аршанскай калёніі быў вызвалены па амністыі былы міністар сельскай гаспадаркі Беларусі ***Васіль Лявонаў***. Амністыя стала мажлівай таму, што В.Лявонаву больш за 60 гадоў, ён ужо адбыў больш за палову тэрміну пакараньня і не парушаў рэжым. (Палітвязень В.Лявонаў быў арыштаваны 14 лістапада 1997 г. і асуджаны 14 студзеня гг. за нібыта крадзяжы маёмасьці ў буйных памерах на 4 гады пазбаўленьня волі і з пазбаўленьнем права на два гады займаць кіруючыя пасады.

Мяркуецца, аднак, што Лукашэнка рабіў зь Лявонавым свае падрахункі. Некалі В.Лявонаў, будучы Сакратаром Магілёўскага абкама КПБ, выратаваў Лукашэнку ад турмы за разбой. Лукашэнка па-свойму „аддзячыў" выратавальніка.

*6 кастрычніка* ў Першамайскім раённым судзе Менска было вынесенае рашэньне па адміністрацыйнай справе ***Уладзімера Раманоўскага***: 10 сутак арышту. Яго абвінавачвалі ў несанкцыянаваным пікетаваньні 25 верасьня, калі ён каля станцыі мэтро *Ўсход* трымаў плякат „Сустрэча з выбаршчыкамі".

*6 кастрычніка* ў Салігорску міліцыя затрымала ***Андрэя Лапановіча*** і ***Зьміцера Тычыну*** і даставіла іх у пастарунак. На іх былі складзеныя пратаколы і сканфіскаваныя ўлёткі, прысьвечаныя байкоту выбараў.

*10 кастрычніка ў Віцебску* атрадам АМАПу (каля 15 чалавек, з аўтаматамі) быў затрыманы ***Яніс Чучман*** (сябра Маладога Фронту), які раскідваў улёткі з тэкстам „Моладзь на выбары ня пойдзе". Яго даставілі ў РАУС Першамайскага раёну, склалі пратакол і зьмясьцілі ў клетку.

*10 кастрычніка ў Менску* брытагаловыя фашысты зьбілі ***Уладзімера Емяльянчыка*** і ***Аляксандра Ружалоўскага*** за тое, што хлопцы размаўлялі па-беларуску. Міліцыянты ўсё бачылі і бязьдзейнічалі. *Ул. Емяльянчык* з траўмамі быў дастаўлены ў шпіталь.

*На пачатку кастрычніка ў Менску* была канфіскаваная маёмасьць былой старшыні Нацбанку Беларусі ***Тамары Віньнікавай***. Падставай для канфіскацыі стаў дэкрэт А.Лукашэнкі, які ён падпісаў летась. Дэкрэт прадугледжвае пазасудовую канфіскацыю маёмасьці асобаў, якія ўчынілі супрацьпраўныя дзеяньні з нанясеньнем буйных матэрыяльных стратаў дзяржаве. Т.Віньнікава, якая цяпер знаходзіцца ў Англіі і мае там статус палітычнага ўцекача, заявіла, што зьбіраецца абскардзіць гэтае рашэньне праз суд, бо калі акупацыйныя ўлады маюць да яе прэтэнзіі, дык яны могуць заявіць іх у адпаведнасьці з міжнароднымі прававымі нормамі.

*10 кастрычніка* арганізатары шэсьця і мітынгу ў г.Орша (Віцебскай вобласьці), прысьвечаных байкатаваньню выбараў, ***Віктар Андрэеў*** і ***Юры Санько*** атрымалі позвы ў міліцыю. 11 кастрычніка на іх былі складзеныя пратаколы адміністрацыйнага правапарушэньня па арт. 167.1 КаАП (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

*11 кастрычніка, Віцебск.* Суд над ***Барысам Хамайдам і Уладзімерам Плешчанкам*** працягваецца. Агітацыя за байкот у прысудзе ўжо ня ўзгадваецца, а за арганізацыю несанкцыянаваных пікетаў Б.Хамайда і У.Плешчанка мусяць выплаціць штраф 150 мінімальных заробкаў (больш за 500 даляраў).

Пасьля прысуду яны зноў разносілі антывыбарчыя ўлёткі ***„Беларуская Салідарнасьць"*** падрыхтаваныя інфармацыйным Цэнтрам Вызвольнага Руху. Тры міліцэйскія машыны актыўна вышуквалі „апазыцыянэраў" у акрузе, дзе балатуецца намесьнік начальніка Віцебскага КГБ **В.Бурак**. Такая пільная ахова электарату ад залішняй для КГБ агітацыі паказальная. *У.Плешчанку* ўдалося ўцячы ад перасьледу, а *Б.Хамайда* быў затрыманы. Яго адвезьлі ў пастарунак, а потым у Першамайскі райвыканкам. Там, у кабінэце нам. старшыні **Г.Мядзьведзевай** на яго быў складзены пратакол па арт.167-3 АК Беларусі („байкот выбараў").

*12 кастрычніка.* На лекцыю па статыстыцы ў Беларускім Дзяржаўным Эканамічным унівэрсітэце зьявіўся дэкан факультэту **В. Н. Платонаў**, які сказаў, што ўсе студэнты павінны прыйсьці на выбары, і падмацаваў сказанае пагрозамі высяленьня з інтэрнату іншагародніх. У канцы гутаркі ён сказаў: „Вы разумееце, мне трэба дапрацаваць да пенсіі". Гэтая рэпліка сьведчыць пра тое, што ціск быў ня толькі на студэнтаў, але і на выкладчыкаў.

*12 кастрычніка ў Менску* двох беларусаў сядзелі на лавачцы на вуліцы Прытыцкага і размаўлялі пра рознае. Падышла п'яная кампанія і пачала ***зьневажаць іх за гаворку па-беларуску***. Завязалася бойка. І тут — унікальны выпадак — адразу пад'ехала міліцыя. Трох п'яных правакатараў, якія аказаліся дзецьмі суддзі, пракурора і супрацоўніка МУС, адразу адпусьцілі, а двух беларусаў адвезьлі ў пастарунак і пачалі катаваць.

Адзін зь беларусаў расказвае: „Мяне „дапытвалі" ўсьлед за ***Алесем Піткевічам***. Калі я зайшоў у кабінэт, дык убачыў дзьве вялікія плямы крыві на падлозе. Потым гэтак атрымалася, што я бачыў Алеся. У яго разьбіты твар, відавочна, зламаны нос. Дасталося і мне..." Падчас катаваньня адзін з міліцыянэраў прызнаўся беларусу: „Зразумей, нам загадваюць, дык мы вас у зямлю закапаем". (Міліцыянт меў на ўвазе бацькоў тых трох „пацярпелых" правакатараў.)

*12 кастрычніка* ў Беларускім універсітэце культуры намесьнік дэкана факультэту бібліятэчна-інфармацыйных сістэмаў **Галіна Дуркіна** спыніла лекцыі па сусьветнай літаратуры. Студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце, накіравалі на прымусовае датэрміновае галасаваньне. Кіраўніцтва ўнівэрсітэту хвалюецца, што 15 кастрычніка (нядзеля) іншагароднія студэнты зьедуць дамоў і не прагаласуюць.

Датэрміновае галасаваньне адбывалася з парушэньнямі Закону аб выбарах — замест пашпарту студэнты прадд'яўлялі студэнцкія білеты (гэта ня ёсьць дакумант, які замяняе пашпарт: там не адзначанае грамадзянства, прапіска і г.д.).

*13 кастрычніка.* У цэнтры Смаргоні ў мінулую нядзелю сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Віктар Туравец*** правёў несанкцыянаваны пікет. Ён трымаў плякат: „*Не — выбарчаму фарсу!; Не — лукашызму!; Не — беззаконьню!*" Да яго падыходзілі людзі, Віктар пераконваў іх, што найлепшы варыянт — няўдзел у выбарчым фарсе. Пікет працягваўся 2 гадзіны. Міліцыянты на пікетоўшчыка ўвагі не зьвярталі. У аўторак Віктар зноў правёў пікет

на тым самым месцы. Раздаваў улёткі. Пратрымаўся 12 хвілінаў: пад'ехала міліцэйская машына і маёр **Падражанец** з сяржантам **Куцько** затрымалі яго і павезьлі ў пастарунак. Там маёр **Коўшык** склаў пратакол і сказаў, што справа будзе перададзеная ў адміністрацыйную камісію райвыканкаму.

У сваім тлумачэньні В.Туравец напісаў: „*Для мяне галоўнае — будучыня маіх дзяцей і нашай Беларусі, таму змагаюся зь нелегітымнай уладай, як магу. Хачу, каб Бацькаўшчына была дэмакратычнай і з законнай уладай..*"

*13 кастрычніка. Сябры* Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — *БНФ* (прыблізна 20 чалавек) правялі каля сядзібы КНГ АБСЭ ў Менску пікет з **патрабаваньнем адстаўкі кіраўніка групы Ганс-Георга Віка і выдаленьні яго зь Беларусі за антыбеларускую дзейнасьць**. Яны былі прынятыя супрацоўнікамі групы АБСЭ, якім пікетоўшчыкі ўручылі свой пратэст.

*13 кастрычніка, Віцебск*. А 15-й гадзіне віцебскія сябры *Партыі БНФ* ***Сяргей Доўгі**, **Марат Волкаў**, **Сяргей Гроць**, **Аляксандар Прахарэнка**, **Уладзімер Патоцкі**, **Юры Мельнікаў**, **Сяргей Сапіра*** выйшлі на пляц Волі як удзельнікі несанкцыянаванага пікету. Пікет быў прысьвечаны байкоту выбараў 15-га кастрычніка. У руках яны трымалі *Бел-Чырвона-Белы сьцяг*, плякаты. Раздавалася віцебскае дэмакратычнае выданьне „Свабоднае слова". Пікетоўцаў арыштавалі.

*13 кастрычніка.* Раніцай жыхары амаль усіх мікрараёнаў *Пінску* маглі пабачыць на сьценах будынкаў мноства вялізных надпісаў: „15 кастрычніка — падман!"; „Не — выбарчаму фарсу!" ды іншыя. Такой колькасьці графіці дагэтуль у Пінску яшчэ не было.

На пачатку працоўнага дня некаторыя надпісы пачалі замалёўваць. (А ў некаторых людных месцах гораду надпісы сатанінскага зьместу альбо проста нецэнзурныя застаюцца некранутымі цягам некалькіх месяцаў і нават гадоў).

Сябры мясцовай філіі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ладзілі ў гэты дзень а 13-й гадзіне санкцыянаваны пікет, у часе якога праз плякаты і размовы заклікалі пінчукоў да няўдзелу ў выбарчым фарсе. Фронтаўцы патрабавалі справядлівых, свабодных і сумленных выбараў. Пікет пільнавалі міліцыянты разам са сваім апэратарам.

*14 кастрычніка ў 2 гадзіны ночы ў Кобрыне* супрацоўнікамі пазаведамаснай аховы былі затрыманыя 4 жыхары гораду, сярод якіх непаўнагадовы ***Зьміцер Вакульчык*** і ягоны брат ***Андрэй Вакульчык***. У затрыманых праверылі дакументы і торбы, у якіх знайшлі брашуру „Край" і бюлетэнь „Змагар". Дапытвалі братоў у РАУС начальнік міліцыі **Седзін** і сьледчы па асабліва важных справах старэйшы оперупаўнаважаны крымінальнага вышуку **С.Марковіч**. Яны прымушалі братоў прызнацца, што тыя расклейвалі ўлёткі і налепкі ў Кобрыне. Хлопцы адмаўляліся, доказаў іх „вінаватасьці" не было. Не дамогшыся прызнаньня, сьледчы і начальнік міліцыі сталі запалохваць, што звольняць з працы іх маці і **Андрэя Вакульчыка**, а Зьміцера выключаць з вучэльні. Пасьля допыту, ня склаўшы пратаколу, у хлопцаў узялі адбіткі пальцаў.

*15 кастрычніка* студэнты Горадзенскага медычнага ўнівэрсітэту напісалі адкрыты ліст у друк. „13 кастрычніка ўсе аддзяленьні ўнівэрсітэту атрымалі загад рэктара вызваліць студэнтаў ад лекцыяў і сэмінараў для ўдзелу ў датэрміновым галасаваньні. Многія прафэсары сталі апантана выконваць загад, пэрсанальна суправаджаючы студэнтаў на выбарчыя ўчасткі. Падобныя захады абурылі нават тых студэнтаў, якія ад пачатку пастанавілі галасаваць. Але далей было горш. А другой гадзіне дэканы факультэтаў мелі сьпіс студэнтаў, якія адмовіліся галасаваць пад ціскам. Хутка перасьлед гэтых студэнтаў наладзілі ў інтэрнатах. Былі сур'ёзныя пагрозы ў бок студэнтаў."

*17 кастрычніка* ў судзе Маскоўскага раёну сталіцы працягваліся слуханьні па грамадзянскім іску ***Аляксандра Шкурко*** да АМАП ГУУС менскага гарвыканкаму. Год таму сп.Шкурко быў затрыманы міліцыяй, дастаўлены ў Партызанскі РАУС, а пры перавозе ў спэцпрыёмнік-размеркавальнік па-зьверску зьбіты разам зь іншымі затрыманымі. На наступны дзень ён атрымаў 5 сутак арышту. Здарэньне гэта мела шырокі рэзананс. Група грамадзянаў падала скаргі на дзеяньні міліцыі. Аднак самым пасьлядоўным аказаўся А.Шкурко. Ён дамогся адмены пастановы суду і перагляду справы, у выніку чаго быў апраўданы. Ня менш намаганьняў спатрэбілася, каб прыцягнуць да суду 11 амапаўцаў, якія зьбівалі тады затрыманых. Суд па грамадзянскаму іску пачаўся яшчэ 30-га траўня. А.Шкурко прад'явіў зыск да АМАПу аб пакрыцьці маральнай і матэрыяльнай страты памерам у 100 мільёнаў рублёў. Высьветлілася, што на працягу ўсяго году А.Шкурко атрымліваў тэлефонныя пагрозы, што яго заб'юць, калі ён ня спыніць справу супраць міліцыі.

К*астрычнік.* Сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Ніна Багінская*** зьвярнулася ў АСБ „Беларусбанк" у Менску, каб аплаціць рахунак, але супрацоўнікі адмовіліся прымаць квіток, таму што ён быў запоўнены ***на беларускай мове***. На патрабаваньні сп.Багінскай прыняць квіток, супрацоўнікі банку залямантавалі, што яна замінае ім працаваць, а супрацоўніца **А.Дзямянкова** і дырэктар філіі **Ю.Ярыга** ў грубай форме зьняважалі яе па-расейску.

*18 кастрычніка.* Назіральнікі за працэсам галасаваньня на „выбарах" 15 кастрычніка склалі каля 1000 пратаколаў аб парушэньнях Закону аб выбарах, якія былі зафіксаваныя ў Магілёўскай вобласьці. Матэрыялы нагляду і правапарушэньняў паказваюць, што выбары па ўсіх акругах горада Магілёва і ў адной выбарчай акрузе Бабруйска не адбыліся. Не адбыліся таксама выбары ў Менску, Баранавічах, Берасьці і практычна ва ўсіх буйных гарадах Беларусі.

*18 кастрычніка.* Старшыня Віцебскага аблвыканкаму **У.Андрэйчанка** выклікаў да сябе падначаленых яму „вертыкальных" і зрабіў ім вымову за зрыў выбараў у абласным цэнтры (4 выбарчыя акругі). У Віцебску прагаласавала 42% выбаршчыкаў (не хапіла 8%). „Вертыкальныя" у сваю чаргу адпаведна адрэагавалі.Так нехта **Філіпенка** (з Чыгуначнага райвыканкаму) на ўсе прадпыемствы, установы, арганізацыі даслаў тэлеграму (пераклад з расейскай): „У сувязі зь неадбыўшыміся выбарамі прашу 17.10.2000г. да 10.00 раніцы паведаміць наступныя зьвесткі: найменьне арганізацыі; прозьвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка; ягоны хатні адрас; нумар акругі, выбарчага ўчастку, дзе мусіў галасаваць і ці прыняў ўдзел у галасаваньні". Такім чынам „вертыкаль" пачынае вышукваць тых, хто не прыняў удзел у выбарчым фарсе (сярод саміх кіраўнікоў, а тыя — сярод сваіх падначаленых).

*19 кастрычніка.* Паводле прысуду, вынесенага суддзёй Аршанскага гарадзкога суду, старшыня Аршанскай суполкі Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ ***Юры Санько*** ды рэдактар гарадзкой незалежнай газэты „Куцейна" ***Віктар Андрэеў*** за арганізацыю недазволеных мітынгу ды шэсьця 8 кастрычніка мусяць выплаціць на карысьць дзяржаўнага рэжыму па 150 мінімальных заробкаў кожны. Прысуд быў агалошаны пасьля 2-дзённага судовага працэсу. Алег Граблеўскі (юрыст Аршанскага вольнага прафсаюзу) прадстаўляў інтарэсы падсудных.

*21 кастрычніка ў Віцебску* адбыўся пікет, прысьвечаны вынікам першага туру выбараў. Акцыя адбылася ў цэнтры Віцебску каля помніка паэтцы Еўдакіі Лось, у ёй удзельнічала каля 30-ці чалавек, пераважна моладзь. Пасьля заканчэньня пікету міліцыянты затрымалі найбольш актыўных удзельнікаў: ***Сяргея Васенку**, **Сяргея Гродзя**, **Юры Мельнікава**, **Уладзімера Патоцкага**, **Сяргея Шапіра**, **Андрэя Саўчанку**, **Сяргея Аксімовіча**, **Яніса Чучмана**, **Марата Волкава**, **Аляксандра Прахарэнку**, **Аляксея Аляксеенку***.

*22 кастрычніка ў Менску* схапілі ***Андрэя Чырца***, які раздаваў незалежныя выданьні каля станцыі мэтро „Ўсход".

*24 кастрычніка* менская міліцыя затрымала сяброў К*ансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.*

Калі настаўніцы ***Галіна Дзягілева*** і ***Алена Ждановіч*** выходзілі з пад'езду пасьля наведваньня сяброў, насустрач ім патрапіліся два міліцыянты, якія, **пачуўшы беларускую мову, адразу накінуліся на жанчын**. **Абшукалі іхныя сумачкі** (на што міліцыянеры ня мелі

права) і знайшлі „крамолу” — *Зварот Зянона Пазьняка да беларусаў.* Адзін зь міліцыянтаў зайшоў у пад’езд і вярнуўся адтуль ужо з улёткамі, у якіх паведамлялася аб сьвяткаваньні *Дзядоў*.

**Міліцыянты груба схапілі жанчын і пацягнулі з сабой, адмовіўшыся паказаць дакуманты**. ***Галіну Дзягілеву* некалькі мэтраў цягнулі волакам па ходніку**. У апорным пункце на вуліцы Алібегава *жанчын груба заштурхнулі ў клетку*, склалі рапарт і пратакол. Адпусьцілі праз 2 гадзіны.

Вось імёны „герояў”: лейтэнанты **Юры Ўладзімеравіч Шут** і **Іван Валер’евіч Раўнейка**. Беларусы. Зусім маладыя людзі. Пэўна, іх чакае бліскучая кар’ера ў акупацыйных ворганах.

*Сьвяткаваньне* ***Дзядоў*** *у Менску афіцыйна дазволена Менгарвыканкамам менавіта для* Кансэрватыўна-Хрысьціянскай *Партыі — БНФ. Міліцыя ня мела ніякага права затрымліваць жанчын з нагоды Дзядоў (пра паводзіны ўжо ня кажам).*

■ У гэты ж дзень а 21.30, каля ўнівэрсама „Віцебск” быў схоплены міліцэйскім патрулём спадар ***Уладзімер Юхо*** за распаўсюджваньне ўлёткі з паведамленьнем пра адзначэньне *Дзядоў* у Менску. У апорным пункце на вуліцы Кальцова міліцыянты склалі на яго рапарт і пратакол. Камандаваў „апэрацыяй” сяржант **Жукоўскі**. Калі сп.Юхо даставілі ў Савецкі РАУС, дзяжурны маёр загадаў вызваліць затрыманага, бо „мерапрыемства дазволенае”.

*25 кастрычніка* Менская Гарадзкая пракуратура прымусіла сьледчых Савецкага раёна пракуратуры вярнуцца да справы пра зьбіцьцё ***Юры Беленькага***. „Амапаўцы, на вачах у масы людзей, накінуліся на мяне, зьбівалі, прычым, з асаблівай жорсткасьцю, — расказвае *Юры Беленькі*. — Мне расказвалі, што калі я страціў прытомнасьць, яны нацягнулі мне на галаву куртку і, каб не засталося сьлядоў, білі па галаве дубінкамі.

Усё гэта амапаўцы здымалі на відэа-стужку. І пасьля гэтага пракуратура адмаўляецца ўзбуджаць крымінальную справу.”

*Замест таго, каб узбудзіць справу на працягу 10 дзён, як патрабуе закон, пракуроры Савецкага раёну больш як месяц высьвятлялі, ці варта справу заводзіць. Юры Беленькі даў сьледчаму* **Ільі Паўлаву** *афіцыйныя мэдычныя даведкі пра раны і траўмы, паведаміў прозьвішчы сьведкаў, спасылаўся на службовую міліцэйскую відэа-стужку тых падзеяў, якую дэманстравалі на працэсах над іншымі ўдзельнікамі Дня Незалежнасьці 25 Сакавіка 2000 г. Але* І.Паўлаў *адмовіўся ўзбуджаць справу.*

Тады Ю.Беленькі абскардзіў адмову. Гарадзкая пракуратура абавязала сваіх падначаленых зноў пачаць праверку заявы спадара Беленькага. Праверку цяпер вядзе іншы сьледчы — **Ільля Зотаў**, які звычайна займаецца тым, што як можа, цягне і замаруджвае справы. *(Паводле радыё „Свабода”. А. Грузьдзіловіч)*

*26 кастрычніка* Менскі гарвыканкам забараніў Беларускаму Гэльсінскаму Камітэту правядзеньне шэсьця ў гонар памяці пра ахвяры нацызму і змагароў супраціўленьня. 26 кастрычніка 1941 г. у Менску гітлераўцы пакаралі сьмерцю 12 актыўных удзельнікаў супраціўленьня. Гэта было першае масавае пакараньне, накіраванае на запалохваньне насельніцтва. У той дзень тры чалавекі былі павешаныя ля прахадной фабрыкі „Чырвоная зара” (цяпер Менскі дрожджавы камбінат). Менскі гарвыканкам дазволіў толькі мітынг каля прахадной камбінату.

*26 кастрычніка* з прыёмнай адміністрацыі самазванага „прэзыдэнта” ў каршэнь выгналі кабет, якія хацелі папасьці на прыём да сакратара Савета бясьпекі **Віктара Шэймана**. Згодна з графікам, быў прыёмны дзень.

Адна з кабет падала скаргу пракуратуру Ленінскага раёна сталіцы, зафіксаваўшы пабіцьцё ў медыцынскай установе і пацьвердзіўшы, што яе зьбілі ў адміністрацыі самазванца.

*27 кастрычніка* ***Віктар Шчытко*** *(бацька)* і ***Уладзімер Шчытко*** *(сын)* аштрафаваныя судом Першамайскага раёну Бабруйска на 10 тысячаў рублёў кожнага за распаўсюджаньне матэрыялаў пра байкот выбараў.

*27 кастрычніка.* Каб забясьпечыць патрэбную колькасьць выбаршчыкаў на „2-гі тур галасаваньня”*(29 кастрычніка)*, заняткі ў Беларускім Дзяржаўным Эканамічным унівэрсітэце перанесьлі з суботы *(4-га лістапада)* на нядзелю *(29 кастрычніка).* Так іншагароднія студэнты былі затрыманыя ў Менску. У дэканаце выкладчыцу Ляўшынскую папярэдзілі, што *29 кастрычніка* а 13-й гадзіне чакаецца праверка з удзелам прарэктара. „Калі студэнтаў ня будзе на занятках, іх чакае сур’ёзная размова”, — паведаміла выкладчыца.

*29 кастрычніка* сябры *Віцебскай Рады Партыі БНФ (Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ))* адзначылі восеньскія *Дзяды.* Насупраць 9-павярховіка на плошчы Перамогі яны ўсталявалі *крыж*. З аднаго боку на хмарачосе высіўся надпіс: „Подвиг советского народа бессмертен!”, — з другога надпіс на *крыжы* паведамляў: *„ТУТ САВЕЦКАЯ ЎЛАДА ЗРУЙНАВАЛА СТАРЭЙШЫЯ Ў ВІЦЕБСКУ МОГІЛКІ”.*

*Узвыжанскія могілкі* пры царкве зьнішчылі ў 60-я гады, калі „саветы” будавалі самую шырокую ў Эўропе гарадзкую плошчу. У гэтым мікрараёне людзей сялілі ў хрушчоўкі, пабудаваныя на касьцях. Тым ня менш, калі за часамі „перабудовы” быў зьняты „гераічны” надпіс, стукачы і ветэраны НКВД абурыліся, пісалі скаргі. Цяпер ён адноўлены.

Ня дзіўна, што сярод савецкага „раю” беларускі крыж, які паставілі хрысьціяне-фронтаўцы, неўзабаве зьнік.

*29 кастрычніка* на *Дзяды* ў Магілёве былі затрыманыя ***Андрусь Кавалёў*** і ***Сяргей Гіркін***.

*30 кастрычніка* пружанскія ўлады існуючага рэжыму вырашылі абмежаваць дзейнасьць мясцовай суполкі ТБМ. Паводле радыё „Свабода” (В.Аксак), у Міністэрства юстыцыі накіравалі ліст за подпісам старшыні райвыканкаму **Аляксандра Юркевіча** з просьбай прыняць захады супраць раённай Рады ТБМ у сувязі, як напісана, з „парушэньнем статутнай дзейнасьці”.

„Парушэньне” актывісты беларушчыны зрабілі падчас асьвячэньня *помніка паўстанцам* Кастуся *Каліноўскага.* Помнік сараку каліноўцам — тутэйшым змагарам за незалежнасьць — паставілі на іхняй магіле ў Ружанскай пушчы мясцовыя сяляне адразу пасьля сьмяртэльнае бітвы з расейскімі карнікамі ў 1863 г. С таго часу помнік ня раз зьнішчалі непрыяцелі Беларусі. Апошні раз — вайскоўцы часткі так званага „беларускага войска”, кіраванага расейцамі, на тэрыторыі якой знаходзіцца цяпер магіла паўстанцаў (на вайсковым палігоне каля Ружанаў). Сёлета яго зноў аднавілі пружанскія адраджэнцы. Цэрымонія асьвячэньня мэмарыялу і сталася падставай для наступу цяперашніх уладаў.

Першая спроба наступу была зроблена 19 кастрычніка ў раённым судзе, праз які ўлады хацелі пакараць за выступ на акцыі асьвячэньня помніка старшыню раённай Рады Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Паты — БНФ ***Генадзя Сароку***.

„Мяне прыцягнулі па арт.167,3 (заклік да байкоту выбараў): „Вы адхіліліся ад сцэнару”. Суд не знайшоў доказаў ягонай віны і не згадзіўся з высновамі ўлады (пра антызаконную дзейнасьць адраджэнцаў). Тады ўлада свае высновы накіравала пракурору Пружанскага раёну, начальніку Абласнога ўпраўленьня юстыцыі ды ў Мін’юст з просьбаю прыняць захады супраць Пружанскай Рады ТБМ. „Захады” двух першых адрасатаў невядомая. А рэакцыя Мін’юста такая: копію ліста пружанскай „улады” накіравалі ў сакратарыят Рэспубліканскай Рады ТБМ з прапановай выказацца наконт дзейнасьці пружанскіх сяброў таварыства.

Рэспубліканская Рада ТБМ станоўча ацаніла дзйнасьць Пружанскай арганізацыі.

■ *Кастрычнік.* Пасьля сіднэйскай Алімпіяды вядучыя беларускія спарцмэны вярнуліся да звычайнай невясёлай рэчаіснасьці. *Аляксандар Яфімаў*, трэнер алімпійскіх прызёраў, заявіў на прэс-канфэрэнцыі ў Менску: „Нас зноў вымушаюць хадзіць па кабінэтах.

Перад Алімпіядай на харчаваньне штодзённа выдзялялася 10 тысячаў рублёў, цяпер толькі 3250. Алімпійскія стыпендыі ўстанаўліваюцца на год, і нам зноў трэба абіваць парогі начальства, каб іх атрымліваць".

■ *30 кастрычніка студэнты Беларускай Акадэміі Мастацтваў правялі* дзьве акцыі пратэсту пад лёзунгам „Студэнт-мастак-жабрак". Пікеты на ганку Акадэміі былі скіраваныя супраць невыносных умоваў вучобы. Студэнты заявілі, што „ўжо некалькі гадоў мы не атрымоўваем неабходнага для працы: цынку, друкарскіх фарбаў, войлаку, асфальту. Такім чынам кіраўніцтва Акадэміі паціху зьнішчае кафэдру станкавай графікі, якая мае глыбокія традыцыі". Да пікетоўцаў прыбыў намесьнік начальніка Першамайскага РАУС, каб іх прыстрашыць. Угаворвалі не пратэставаць і ў рэктарацэ, абяцаючы ўсё наладзіць. Але студэнты зноў выйшлі з плякатамі: *„Без культуры няма будучыні!", „Ня дайце памерці беларускаму мастацтву".*

*31 кастрычніка* суд у Бабруйску вынес папярэджаньне ***Яўгену Чапурышкіну*** за арганізацыю несанкцыянаванага сходу.

*Кастрычнік.* <u>Грамадзяне, якія былі затрыманыя міліцыяй і на якіх складзеныя пратаколы адміністрацыйнага затрыманьня, і грамадзяне, прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці *(па матэрыялах „Вясны-96"):*</u>

***Аляксандар Кадукоў*** (Менск; далей для жыхароў Менску горад не пазначаецца) — *штраф 2 мінімальныя заробкі (мін.з.);* ***Міхаіл Аржаеў*** *– штраф 2 мін.з.;* ***Лявон Баршчэўскі*** *– штраф 5 мін.з.;* ***Уладзімер Кішкурна*** *– штраф 5 мін.з.;* ***Лявон Садоўскі*** *– штраф 5 мін.з.;* ***Сяргей Карбоўскі*** *– папярэджаньне;* ***Валянцін Гатоўкін*** *– папярэджаньне;* ***Аляксандар Катляроў*** *(Слуцк) – папярэджаньне;* ***Віктар Івашкевіч*** *– штраф 5 мін.з.;* ***Зьміцер Касьцюкевіч*** *– штраф 2 мін.з.;* ***Алесь Бяляцкі*** *– штраф 2 мін.з.;* ***Юры Хадыка*** *– штраф 2 мін.з.;* ***Сяргей Рабкевіч*** *– штраф 1 мін.з.;* ***Алена Рашэтнікава*** *– затрымлівалася;* ***Мікалай Раманаў*** *– штраф 1 мін.з.;* ***Сяргей Шынкевіч*** *– штраф 150 мін.з.;* ***Аляксей Андросаў*** *– справа накіраваная ў камісію па непаўнагадовых;* ***Ігар Маханёк*** *– справа накіраваная ў камісію па непаўнагадовых;* ***Марына Сініцына*** *– затрымлівалася;* ***Цімафей Акудовіч*** *– справа накіраваная ў камісію па непаўнагадовых;* ***Валеры Жэрбін*** *– затрымліваўся;* ***Валянцін Голубеў*** *– штраф 5 мін.з.;* ***Сяргей Міхноў*** *– штраф 10 мін.з.;* ***Яўген Афнагель*** *– затрымліваўся;* ***Сяргей Альфер*** *– папярэджаньне;* ***Максім Абрамчук*** *– справа накіраваная ў камісію па непаўнагадовых;* ***Павел Юхневіч*** *– справа накіраваная ў камісію па непаўнагадовых;* ***Эдуард Грынявецкі*** *(Бабруйск) – затрымліваўся;* ***Сяргей Ярац*** *– затрымліваўся;* ***Сяргей Грынь*** *(Берасьце) – затрымліваўся;* ***Раман Бабаеўскі*** *– затрымліваўся;* ***Валеры Арэхаў*** – затрымліваўся; ***Сяргей Андросаў*** *– затрымліваўся;* ***Юры Войцікаў*** *(Ліда) – затрымліваўся;* ***Артур Ганько*** *(Ліда) – затрымліваўся;* ***Анастасія Мароз*** *(Рэчыца, непоўнагадовая) – затрымлівалася;* ***Венядзікт Кляўзэ*** *(непаўнагадовы) – затрымліваўся;* ***Яўген Суднік*** *(непаўнагадовы) – штраф 2 мін.з.;* ***Зьміцер Бялькевіч*** *(непаўнагадовы) – справа накіраваная ў камісію па непаўнагадовых;* ***Ільля Ядранцаў*** *– справа накіраваная ў камісію па непаўнагадовых;* ***Сяргей Савін*** *– затрымліваўся;* ***Аляксей Кубранаў*** *– штраф 1 мін.з.;* ***Мікола Зялёнка*** *— жыхар Баранавічаў, затрыманы ў Гомлі;;* ***Мікола Агароднік*** *– жыхар Баранавічаў, затрыманы ў Гомлі;* ***Уладзімер Раманоўскі*** *– 10 сутак арышту;* ***Корбан Юрась*** *– жыхар Віцебску, затрыманы ў Воршы;* ***Сяргей Паўленка*** *(Горадня) – затрымліваўся;* ***Зьміцер Касьпяровіч*** *– затрымліваўся;* ***Яўген Туравец*** *(*Клецк*) – затрымліваўся;* ***Павел Красоўскі*** *(Жодзіна) – справа накіраваная ў камісію па непаўнагадовых;* ***Павел Драбеня*** *(Слуцк) – затрымліваўся;* ***Генадзь Самойленка*** *(Жабінка) – штраф 3 мін.з.;* ***Сяргей Адзінец*** *– затрымліваўся;* ***Васіль Шабуневіч*** *– затрымліваўся;* ***Людзьміла Гразнова*** *– складзены пратакол за выступ на мітынгу;* ***Анатоль Паплаўны*** *(Гомель) – штраф 10 тыс. рублёў;* ***Генадзь Туркоўскі*** *(Жлобін) – затрымліваўся;* ***Віктар Волатаў*** *(Жлобін) – затрымліваўся;* ***Сяргей П'яных*** *– штраф 8 мін.з.;* ***Андрэй Дзьвігун*** *(Магілёў) — быў затрыманы;* ***Сяргей Кухарэнка*** *(Полацк) – затрымліваўся;* ***Валеры Сівуха*** *(Магілёў) – штраф 2 мін.з.;* ***Аляксей Губко*** (Магілёў) *– штраф 2 мін.з.;* ***Мікалай Ужоў*** *(Магілёў) – штраф 2 мін.з.;* ***Васіль Андрасюк*** *(Берасьце) – затрымліваўся;* ***Міхась Чыжык*** *– штраф 1 мін.з.;* ***Андрэй Церашкоў*** *– затрымліваўся;* ***Натальля Емельянава*** *– затрымлівалася;* ***Сьвятлана Філатава*** *(Магілёў) – затрымлівалася;* ***Віталь Радкевіч*** *– затрымліваўся;* ***Андрэй Лапановіч*** *(Салігорск) — затрымліваўся;* ***Тычына Зьміцер*** *(Салігорск) – затрымліваўся;* ***Шасьцюк Сяргей*** *(Ліда) – затрымліваўся;* ***Васіль Андрасюк*** *(Берасьце) – затрымліваўся;* ***Анатоль Лобан*** *(Салігорск) – затрымліваўся;* ***Мікалай Івашын*** *(Горадня) – штраф 2 мін.з.; звольнены з працы;* ***Валянцін Кухаронак*** *(Сьмілавічы) – штраф 2 мін.з.;* ***Тадэвуш Шусьціцкі*** *– затрымліваўся;* ***Яніс Чучман*** *(Віцебск) – затрымліваўся;* ***Ян Росьлік*** *– затрымліваўся;* ***Мікалай Садоўскі*** *– затрымліваўся;* ***Галіна Юрына*** *– затрымлівалася;* ***Віктар Андрэеў*** *(Ворша) – затрымліваўся;* ***Юры Санько*** *(Ворша) – штраф 150 мін.з.;* ***Уладзімер Патоцкі*** *(Віцебск) – затрымліваўся;* ***Юры Мельнікаў*** *(Віцебск) – затрымліваўся;* ***Аляксандр Прахарэнка*** *(Віцебск) — затрымліваўся;* ***Сяргей Гродзь*** *(Віцебск) – затрымліваўся;* ***Сяргей Шапіра*** *(Віцебск) – затрымліваўся;* ***Сяргей Шэндараў*** *(Бабруйск) – затрымліваўся;* ***Віктар Ахранчук*** *(Сьветлагорск) – штраф 5 мін.з.;* ***Уладзімер Шчытко*** *(бацька, Бабруйск) – затрымліваўся, штраф 10 тыс. рублёў;* ***Уладзімер Шчытко*** *(сын, Бабруйск) – затрымліваўся, штраф 10 тыс. рублёў;* ***Натальля Кірыенкава*** *(Горкі) – затрымлівалася;* ***Галіна Будная*** *(Горкі) – затрымлівалася;* ***Зьміцер Франкоўскі*** *(Горкі) – затрымліваўся;* ***Аляксей Шыдлоўскі*** *– затрымліваўся*; ***Мікола Прыварнікаў*** *– затрымліваўся;* ***Уладзімер Бордак*** *– затрымліваўся;* ***Аркадзь Галай*** *– затрымліваўся;* ***Галіна Зюзіна*** *(Магілёў) — студэнтка Магілёўскага дзяржуніверсітэту, звольненая з ВНУ;* ***Мікалай Івашын*** *(*Гомель*) — штраф 2 мін.з.; звольнены з працы;* ***Максім Абрамчук*** *— непаўнагадовы, затрымліваўся;* ***Андрэй Дзьвігун*** *— затрымліваўся.*

<u>Грамадзяне, затрыманыя без складаньня пратаколу</u>*:*

***Зоя Чаропка***, ***Аляксандар Карызна***, ***Віталь Радкевіч***, ***Сяргей Сінякоў***, ***В. Макаранка***, ***Васіль Палякоў*** *(Гомель),* ***Уладзімер Калішэвіч*** *(Магілеў),* ***Уладзімер Вялічкін*** *(Берасьце),* ***В. Апаляйчук*** *(Берасьце),* ***Сяргей Гіркін*** *(Магілеў),* ***Андрэй Качуроўскі*** *(Магілеў),* ***Рыгор Варвашэвіч*** *(Берасьце),* ***Жана Холусева***, ***Андрэй Понасаў*** *(Сьветлагорск),* ***Алесь Шэвяленка*** *(Сьветлагорск),* ***Андрэй Бандарэнка***, ***Сяргей Юсьцін***, ***Кацярына Шыкуць*** *(Жодзіна),* ***Станіслаў Івашкевіч***.

<u>Грамадзяне, затрыманыя падчас маладзёвай акцыі пратэсту 12 лістапада:</u>

МЕНСК – усяго было затрымана *112* чалавек, сьпіс няпоўны:

***Сяргей Шмялёў***, ***Алесь Філіповіч***, ***Зялёнкін***, ***Бурацкі***, ***Алесь Стральцоў***, ***Дзяніс Яроменка***, ***Руслан Харкевіч***, ***Павел Савіч*** *(17 гадоў),* ***Павел Гетман***, ***Віталь Дзятовіч***, ***Алесь Андросаў***, ***Аляксей Мікалайчык***, ***Марыя Куніна***, ***Аляксандар Каліна***, ***Сяргей Астапчук*** *(17 гадоў),* ***Аляксей Жарко*** *(17 гадоў),* ***Сяргей Атрошчанка*** *(16 гадоў),* ***Аляксей Шалахоўскі***, ***Паліна Маскалёва*** *(непаўнагадовая),* ***Зьміцер Хоміч***, ***Зьміцер Мілай*** *(непаўнагадовы),* ***Антось Балук*** *(14 гадоў),* ***Іван Цітовіч***, ***Цімох Атрашчанкоў*** *(непаўнагадовы),* ***Васіль Вянярскі***, ***Андрэй Шаўчук*** *(14 гадоў),* ***Антон Сіліцкі*** *(17 гадоў),* ***Павел Мятліцкі***, ***Уладзімер Старыковіч***, ***Зьміцер Чарнянок***, ***Яўген Макееў***, ***Міхаіл Гапановіч*** *(16 гадоў),* ***Васіль Мыцык*** *(17 гадоў),* ***Зьміцер Смалякоў*** *(15 гадоў),* ***Іван Малафееў*** *(17 гадоў),* ***Зьміцер Хаменка*** *(15 гадоў),* ***Андрэй Бабій***, ***Аляксей Бузук***, ***Андрэй Мазоўка*** *– штраф 20 мін.з.;* ***Уладзімер Самончанка — *** *штраф 20 мін.з.;* ***Кірыл Чулкоў*** *— папярэджаньне;* ***Вольга Цімашук*** *— папярэджаньне;* ***Уладзімер Лыско*** *– штраф 20 мін.з.;* ***Віталь Кошалеў*** *— папярэджаньне;* ***Андрэй Юркавец*** *– 3 сутак арышту;* ***Надзея Грачуха*** *— папярэджаньне;*

***Уладзімер Ткачэнка*** *— папярэджаньне;* ***Яраслаў Малішэўскі*** *— папярэджаньне;* ***Хрысьціна Сідун****,* ***Андрэй Вітушка****,* ***Алесь Дубінчук*** *(Пухавічы, непаўнагадовы) — да 14.11.2000г. утрымліваўся ў дзіцячым спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку;* ***Алесь Бельскі*** *(Пухавічы, непаўнагадовы) — утрымліваўся там жа;* ***Андрэй Іваноў****,* ***Андрэй Макрэцкі****,* ***Віталь Дыначоўскі****,* ***Дзяніс Еўсікаў****,* ***Віктар Пацэль****,* ***Уладзімер Тараканаў****,* ***Зьміцер Грынкевіч****,* ***Павел Кірылаў****,* ***Кірыла Пазьняк****,* ***Вадзім Доўнар****,* ***Сяргей Пьяных****,* ***Юры Грыгор'еў*** *— папярэджаньне;*

*ГОРАДНЯ****:*** ***Андрэй Мялешка*** *– штраф 30 мін.з.;* ***Сьвятлана Нех****,* ***Вадзім Саранчукоў****,* ***Андрэй Мельнікаў*** *– штраф 20 мін.з.;* ***Дзяніс Міхальчык*** *— штраф 30 мін.з.;* ***Алесь Лашкоўскі****,* ***Ігар Бабкін, Вольга Іванова****,* ***Натальля Капцэвіч*** *— штраф 50 мін.з.;* ***Вольга Камягіна****,* ***Алена Машкала*** *— папярэджаньне, 20 мін.з.;* ***Вольга Філіповіч*** *— папярэджаньне;* ***Зьміцер Ягораў****,* ***Сяргей Клімук*** *— штраф 30 мін.з.;* ***Іна Мялешка*** *— папярэджаньне;*

*БАРЫСАЎ****:*** ***Міхась Кузьняцоў*** *— штраф 3 тысячы рублёў;* ***Алена Ясюк****,* ***Марына Ясюк****,* ***Міхась Кузьняцоў*** *— штраф 2 тысячы рублёў;*

*1 лістапада ў ГОРАДНІ* падчас ушанаваньня ***Дня Памяці продкаў Дзяды*** былі затрыманыя міліцыяй***:*** ***Сьвятлана Нех*** *— штраф 150 мін.з.;* ***Аксана Мілюн****,* ***Мікола Воран****,* ***Пётр Анісімовіч****,* ***Вадзім Саранчукоў*** *— папярэджаньне;* ***Юлія Дарашкевіч****,* ***Вольга Іванова*** *– штраф 25 мін.з.;* ***Ірына Данілоўская****,* ***Зьміцер Іваноўскі****,* ***Зьміцер Хільмановіч****,* ***Генадзь Кургун****,* ***Віктар Кірэеў****,* ***Веслаў Біруля****,* ***Раман Рамашка****,* ***Ірына Салей****,* ***Кастусь Жынь****,* ***Аляксандар Міхальчык****,* ***Сяргей Мальчык****,* ***Сьвятлана Станкевіч****,* ***Сяргей Антусевіч****,* ***Уладзімер Чартапалаў****,* ***Ігар Бабкін****,* ***Дзяніс Івашын****,* ***Андрэй Мялешка*** *— штраф 170 мін.з.;* ***Алесь Лашкоўскі*** *— штраф 30 мін.з.;* ***Сяргей Клімук*** *— штраф 30 мін.з.*

*11 лістапада ў Менску* міліцыянты затрымалі *62-гадовую* ***Алену Ярмоленку****,* якая расклейвала ўлёткі. Быў складзены пратакол.

***Інфармацыйная камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

# ВА ЎНІВЭРСІТЭЦЕ ЛУІЗІЯНЫ СТУДЭНТАЎ НЕ ВЫКЛЮЧАЮЦЬ ЗА БЕЛАРУСКУЮ КАШУЛЮ

*9-га сьнежня* адбыўся чарговы сход Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня. На ім спадарыня ***Ала Орса-Рамана*** паінфармавала пра выставу нацыянальных строяў ва ўнівэрсітэце штату Луізіяна, на якую сябры аддзелу перадавалі шэраг строяў. Калі арганізатары гэтае выставы зьвярнуліся ў беларускую амбасаду з просьбай дапамагчы ім знайсьці беларускія строі, то там дапамагчы адмовіліся. (Дзіва што, у беларускіх унівэрсітэтах цяпер за нашэньне беларускай кашулі выключаюць студэнтаў з вучэльні*, а тут — „дапамажыце". Наіўныя людзі жывуць у штаце Луізіяна.) А між тым беларускія строі карысталіся на выставе вялікаю цікавасьцю ў наведвальнікаў.

* гл. „Беларускія Ведамасьці" №6(29)/2000

# НАРОД ГІБЕЕ, НАЧАЛЬСТВА — ШАЛЕЕ

Лукашэнкаўскія „вертыкальныя" з грашыма не цырымоняцца. Распараджаюцца на шырокую нагу.

Асаблівую заклапочанасьць фінансістаў Міністэрства фінансаў выклікае выкарыстаньне валютных сродкаў у Магілёўскай вобласьці. Выдаткі на камандзіроўкі за мяжу павялічваюцца, і ў першым паўгоддзі 2000-га г. на гэтыя мэты было выдаткавана амаль 3 мільёны даляраў. (У гэты час уся вобласьць была вінаватая за расейскі газ 6 мільёнаў даляраў). Паводле дадзеных праверкі, на ўтрыманьне Магілёўскага аблвыканкаму рэальна выдаткоўваецца сродкаў амаль што напалову больш, чым гэта плянуецца бюджэтам. На мясцовую „вертыкаль" ня ўзьдзейнічаюць дэкрэты Лукашэнкі па скарачэньні выдаткаў. Аўтамабілі, кандыцыянеры, аўтасігналізацыі, магнітолы, радыёстанцыі, мабільнаяая сувязь — асноўныя артыкулы перарасходу. Праблема яшчэ і ў тым, што для чыноўнікаў, у асноўным, набываюцца дарагія аўтамабілі вытворчасьці Нямеччыны, Швэцыі і Японіі, рамонт і запасныя часткі для якіх спусташаюць фонд транспартных выдаткаў за паўгады. Аўтапарк абласной „вертыкалі" прыстойны і дастатковы, але Аблвыканкам настойліва працягвае набываць новыя аўтамабілі, а непатрэбныя бясплатна перадае асобным арганізацыям. У 1999 г. для службовай кватэры кіраўніка вобласьці **Міхаіла Дражына** была набытая маёмасьць на суму амаль 2 мільёны дэнамінаваных рублёў. За няпоўныя 2 гады бухгалтэрыя налічыла знос маёмасьці аж на чвэрць гэтай сумы.

***(Паводле радыё „Свабода". М.Усьціновіч)***

# БЕЛАРУСЫ ПАД АКУПАЦЫЯЙ:

## *Як дзейнічалі партызаны тульскага паходжаньня*

*Ільля Копыл* зь Менску, згадваючы пра гадавіну нападу фашыстоўскае Нямеччыны на Савецкі Саюз, распавядае пра партызанскі рух ў Беларусі. Ён піша: „Пра вайну я ведаю не па чутках, таму што ад яе пачатку і да вызваленьня жыў у акупацыі, у вёсцы *Нябышына*, што на *Бягомальшчыне*. Хацеў бы паразважаць пра міты, што складзеныя пра партызанскі рух у Беларусі. Адзін зь мітаў – тое, што партызаны нанесьлі немцам вялікія страты.

Праз нашую вёску пралягае адна з дарог *Докшыцы – Бягомль*. Гэтай дарогаю немцы амаль не карысталіся: можа, за тыдзень праяжджала адна ці дзьве машыны. Але ж партызаны ўначы разбурылі й спалілі мост цераз раку *Поня* побач з нашай вёскаю. Яны маглі спаліць гэты мост і ўдзень, бо немцы яго не вартавалі. І шкоду яны нанесьлі найперш жыхарам нашай ды суседніх вёсак. А ў Маскву паляцела данясеньне, нібы зьнішчаны стратэгічны аб'ект. І потым прыкладна раз на тыдзень яны зноў і зноў зьнішчалі тое, што пасьпявалі аднавіць вяскоўцы з дапамогаю нямецкага інжынэра. А калі на просьбу вяскоўцаў немцы ўначы сталі ахоўваць мост, партызаны папярэдзілі, каб ніхто пад пагрозаю расстрэлу не выходзіў на рамонтныя работы.

Яшчэ адзін міт – нібы партызаншчына сярод беларусаў была масавай зьявою. З нашай вёскі за першыя два гады ў партызаны не пайшоў аніводзін чалавек. У паліцыянты запісаўся ўсяго адзін хлапец – потым ён і стаў першым партызанам.

У нашай мясцовасьці дзейнічала партызанская брыгада „Жалязьняк". Спачатку ў ёй было ўсяго тры атрады. Акрамя нумароў, гэтыя атрады мелі назвы – „Вяцкі", „Тульскі", „Маскоўскі" – паводле мясьцінаў, дзе яны фармаваліся. Штаб брыгады фармаваўся ў падмаскоўнай Барвісе, а камандзірам быў прызначаны былы камандзір сапёрнае роты з Тульскай вобласьці Ціткоў. Гэта былі, хутчэй, не партызаны, а часткі Чырвонай Арміі, якія перакінулі ў тыл немцаў. Да іх далучылася невялікая колькасьць мясцовых камуністаў і савецкіх апаратчыкаў, якія не пасьпелі ўцячы на Ўсход і хаваліся ў лясох.

Трэці міт – што партызаны абаранялі жыхароў ад немцаў. У сапраўднасьці яны часьцей правакавалі немцаў і рабілі жыцьцё мірных жыхароў небясьпечным. У нашай мясцовасьці калі немцы плянавалі нейкія апэрацыі супраць партызанаў і партызаны пра гэта даведваліся, дык зьнікалі зь вёсак моўчкі, і ніколі не папярэджвалі вяскоўцаў пра небясьпеку. Пра яе мы, як правіла, даведваліся ад

жыхароў вёскі *Восава*, да якой было празь лес 6 кілёмэтраў. Ратавалі сябе самі, як маглі. Не „дзякуючы партызанам”, а насуперак ім.

Партызанскія начальнікі пасьля вызваленьня ў сваіх зонах сталі партыйнымі сакратарамі. Усе галоўныя пасады апынуліся ў іхных руках. Жыхар Тульскае вобласьці ў Расеі Ціткоў стаў першым сакратаром Бягомальскага раённага камітэту партыі. Да вайны наш раён быў сапраўды беларускім. За гады кіраваньня Ціткова ўсё было пераведзена на расейскую мову, і стала амаль гэтак, як у Туле”.

***(З эфіру радыё „Свабода”)***

## *Настаўнік*

*Усе надзеі на сьветлую будучыню Беларусі беларускія адраджэнцы (палітыкі, пісьменьнікі, настаўнікі, культурныя дзеячы, навукоўцы) пачатку XX-га стагоддзя — зьвязвалі зь вёскай. У ёй быў магутны некрануты беларускі патэнцыял. Ён акрыляў адраджэнцаў.*

*Мінула XX-е стагоддзе...*

* * *

*Вячаслаў Сьцяпанаў з Гарадоцкага раёну Віцебскай вобласьці:* „Тое, што адбываецца апошнія гады зь вёскай, бяз сьлёз апісаць немагчыма: пануюць беднасьць, убоства і беспрабуднае п’янства. Вельмі шкада дзяцей. Некаторыя прыходзяць у школу ледзь ні басанож, у парваных гумовых ботах, у старым брудным адзеньні. Такога, напэўна, не было нават у галодныя пасьляваенныя гады. Хочацца дапамагчы ім, але як, калі ты сам, настаўнік, ледзь зводзіш канцы з канцамі. Не заўсёды хапае зарплаты нават на ежу. Вёска гіне, і няма ніякай веры ў тое, што хоць нешта можна зьмяніць ў блізкім часе.

Разам зь ёй гінем і мы, тыя нешматлікія, каго называюць вясковай інтэлігенцыяй.

Асабіста я больш цярпець не магу, зьбіраюся зьехаць з гэтай краіны, ад гэтай безнадзейнасьці і безвыходнасьці, хоць і вельмі люблю Беларусь.

Зараз п’юць, як не пілі нават у 70-я гады. Усё часьцей можна пабачыць п’яных жанчын — зьява раней для вёскі надзвычай рэдкая. Галоўнае — сьпіваюцца тыя нешматлікія цягавітыя мужыкі, якія працаваць могуць і хочуць, але не за мізэрны, амаль аднолькавы для ўсіх, заробак, якога трэба чакаць некалькі месяцаў.

Усё гэта адбываецца на фоне афіцыйнага ўхваленьня калгаснага ладу і бясконцых дажынак, на якіх сьвяткуюць невядома што, якія для любога, хто знаёмы з побытам цяперашняй беларускай вёскі, толькі яшчэ больш выразна падкрэсьліваюць глыбіню гэтага заняпаду.”

***(Паводле радыё „Свабода”)***

# ПАМЯТАЕМ БЕЛАРУСКІХ ГЕРОЯЎ

Сьвіслаччына стала месцам правядзеньня Ўсебеларускага фэсту, прысьвечанага памяці нацыянальных герояў *Беларускага Вызвольнага Руху 1863-1864 гг.* Сонечнай раніцай *22 кастрычніка* на месца збору *ў Сьвіслачы* ўжо а 9-й гадзіне выехала моладзь зь *Бераставіцы* і *Ваўкавыска*, потым да іх далучылася шматлікая дэлегацыя з *Горадні*, завіталі госьці зь *Ліды, Слоніма, Зэльвы, Менска*, іншых гарадоў і куткоў Беларусі. Сабралася больш за трыста ўдзельнікаў сьвяточнага мерапрыемства, сярод іх і замежныя госьці з *Летувы, Польшчы,* нават *Нямеччыны*. Прыехалі барды: Віктар Шалкевіч з Горадні, Андрэй Мельнікаў з Наваполацка, Зьміцер Бартосік зь Менска, Дзітэр Кілька з Нямеччыны, прадстаўнікі палітычных партыяў, грамадзкіх аб’яднаньняў і арганізацыяў.

Моладзь Саюза палякаў і маладыя беларусы паставілі кошыкі з кветкамі да помнікаў сваім нацыянальным героям ***Рамуальду Траўгуту*** і ***Кастусю Каліноўскаму***. На магіле ***Віктара Каліноўскага***, якая знаходзіцца побач з праваслаўнай царквой у Сьвіслачы, аб героях мінулага паўстаньня расказалі *Уладзімер Хільмановіч* і *Дзьмітры*



***Удзельнікі Ўсебеларускага Фэсту, прысьвечанага памяці нацыянальных герояў Беларускага Вызвольнага Руху 1863-1864 гг. Фота Г. Радзецкага***

*Кісель,* прафэсар Горадзенскага ўнівэрсітэта *Аляксей Пяткевіч.* Айцец *Ян* прачытаў памінальную малітву, а хор вернікаў выканаў урачысты гімн ***Магутны Божа***. У памяць аб героях Вызвольнага Руху 1863-1864 гг. на магілу ідэйнаму настаўніку Кастуся Каліноўскага, яго брату ***Віктару***, маладыя дзяўчаткі ўсклалі кветкі.

Потым удзельнікі фэсту наведалі сядзібу Каліноўскіх у вёсцы *Якушоўка,* што непадалёк ад Сьвіслачы. Там у мінулым годзе сябрамі *Грамады* і *Беларускага Народнага Фронту* быў усталяваны ***Крыж Памяці***. Там адбыўся мітынг. Потым сярод векавых соснаў гучэў урачысты канцэрт бардаў.

***Анатоль ВАЛЮК***

# СЬВЯТА Ў ЧЭХАХ

Сьвята на вёсцы. Вы, калі не жыхар вясковы, дык ці зразумееце, на колькі гэта сёньня рэдкая зьява. Бывае і год міне, а ніводнага сьвята тут і не адбылося. Вось ліха зь бядою — тут процьма, а сьвята... Але вось такое дзіва здарылася ў вёсцы пад назвай *Чэхі*, што на *Нараччыне.* Тут 10-га лістапада, напрыканцы *Дня ўшанаваньня Памяці Продкаў*, адбылася неардынарная падзея — усталяваньне крыжа. Магчыма, дзесьці гэта ёсьць звычайнай рэччу, але тут усталяваньне прайшло надзвычай сьвяточна й урачыста, ператварыўшыся ў падзею. Яшчэ напярэдадні ішлі дажджы й наваколье выглядала пахмурна. Але раптам дзівосна ўзыйграла сонейка ды прасьвятліла змаркочаныя твары ўсіх тут сабраных людзей, якія прыйшлі ды прыехалі, хто зблізу, хто здалёк.

У сьвяце прынялі ўдзел і два сьвятары. Акрамя мясцовага пробашча ксяндза ***Аркадзя Куляхі***, быў пробашч Менскай грэка-каталіцкай парафіі *іконы Маці Божае Нястомнай Дапамогі* айцец ***Казімір Ляховіч***. Падараваў гэтае сьвята тутэйшы жыхар, сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Алесь Цыркуноў***.

Трэба зазначыць, што да гэтае справы спрычыніліся й шмат іншых добрых людзей. Матэрыял на крыж (а гэта ледзь не сямі мэтраў) быў адшуканы, апрацаваны й дастаўлены на месца жыхаром вёскі *Ясева Пастаўскага раёну* ***Владэкам Шалаем***, за што яму асабістая падзяка й нізкі паклон.

Шмат дапамогі было аказана й мясцовымі людзьмі, асабліва сям’ёю спадарыні ***Тэні Русак***. Чула рэагавалі на патрэбу дапамогі й людзі з суседніх вёсак. Асабістая падзяка кавалю зь мястэчка *Паставы* ***Юрасю Фурсу***, які самаахвярна выканаў для крыжа ўсё мэталічнае аздабленьне. Няхай ўсім ім Госпад Бог аддасьць належнае.

Што тычыцца самаго крыжа, дык незвычайнасьць ягоная заключаецца ня столькі ў памерах (лічы шэсьць мэтраў) ды форме — шасьціканцовай, накшталт *Крыжа сьвятой* ***Эўфрасіньні Полацкай***, — колькі ў зьмесьце, які прачытваецца пры больш пільным яго аглядзе. Зьверху крыж ачолены галубом — сымвалам Сьвятога Духа — ды зьмяшчае на пяці канцох дзесяць рэльефных мэдальёнаў, сярод якіх ёсьць выявы абразоў альбо сьвятых, што ўшаноўваюцца вернікамі ўсіх традыцыйных хрысьціянскіх канфэсіяў Беларусі. На дольнай папярэчыне разьмешчаныя выявы ***Хрыста, Маці Божай*** і ***Арханёла Габрыэля***, на верхняй — *сьвятога* ***Язафата Кунцэвіча*** й ***Кірылы Тураўскага***. Паўночны бок крыжа ўпрыгожваюць выявы *арханёла Міхаіла*, *сьвятой Эўфрасіньні Полацкай*, *сьвятога Казіміра* й дзьве іконы ***Маці Божай — Вострабрамскай і Жыровіцкай***. Між гэтымі абразамі, на перакрыжаваньні, з дынамічнага трохкутніка на нас і ўвесь белы сьвет пазірае сымбалічнае ***Вока Творцы***. Ніжэй Яго, па вертыкалі, разьмешчаны тэкст малітоўнага надпісу. Цэнтрам усёй кампазыцыі зьяўляецца рэльефная выява *ўкрыжаванага Хрыста.*

Асаблівым нюансам зьяўляецца тое, што цярновы вянок зроблены з пруткоў сапраўднага калючага дроту, што выкарыстоўваўся тут калісьці то нямецкімі, то савецкімі захопнікамі, якія несьлі гэтаму гаротнаму краю адно разбурэньне, кроў ды сьлёзы. *Усё гэта сымбалізуе адзінства з Хрыстовымі пакутамі, якія Ён яшчэ раней за ўсіх людзей узяў на Сябе.*

Гора людзкое, большае ці меншае, як паказвае час, знаходзіцца ў простай залежнасьці ад таго, наколькі глыбока й праўдзіва чалавек прымае Бога ў сваё сэрца, каму ён больш паслугоўвае — Усявышняму Госпаду Богу ці Ягонаму галоўнаму супрацоўніку, цемрашалу.

Ніжэй выявы Хрыста месьціцца надпіс, зроблены ў стылі старaславянскай вязі, напісаны на беларускай мове. Гэты тэкст (узяты са старых богаслужбоўнікаў) тройчы ў год выкарыстоўваецца на буйнейшых богаслужэньнях. Пачынаецца ён словамі: „Крыжу Твайму пакланяемся...” Унізе, пад тэкстам, у пашыранай аснове крыжа, знаходзіцца выява чэрапа й двух костак, якая азначае парэшткі чалавека ды нагадвае аб мітусьлівасьці й нікчэмнасьці існаваньня ягонага цела ў стасунку да няўміручасьці Богалюбнага Духа.

Завяршае ўсю кампазыцыю каменная горка, што ўвасабляе Галгофу. Разам зь невялікім курганам, адмыслова тут зробленым, усё гэта сымвалізуе Кальварыю.

Падчас асьвячэньня крыжа айцец Аркадзь прачытаў належную малітву па-беларуску. Потым некалькі прывітальных слоў да сабраных прамовіў аўтар гэтага нязвыклага экумэнічнага твору, што сымбалізуе адзінства ўсіх хрысьціян. Спадар Алесь адзначыў, што ён імкнуўся, ня гледзячы на перашкоды й цяжкасьці, усталяваць гэты крыж менавіта сёлета й менавіта падчас гэтых Сьвятаў напрыканцы тысячагоддзя, каб, сустракаючы новае, народ наш крочыў у будучыню, напоўнены верою ды надзеяй. А будучыня, асьвечаная сымбалем Сьвятога Крыжа, абавязкова будзе іншаю, лепшаю й непадобнаю да жудаснай мінуўшчыны; што толькі любасьць усіх да ўсіх і ўсяго можа азначаць сапраўдную Любоў да Бога, даючы кожнаму збаўленьне й Жыццё Няўміручае.

На заканчэньне сьвята былі прасьпяваныя належныя малітвы й ускладзены кветкі да „Галгофы”.

***Алесь ЧАХОВІЧ***



***Крыж у Чэхах. Рабочы момант аздабленьня крыжа.***

# І Я ГАТОВЫ ЁЙ СЛУЖЫЦЬ.

***Міхаіл Лебядзюк*** зь Берасьця (яму 24 гады) нядаўна зьбіраўся паступаць у Менскую духоўную сэмінарыю, але пабываўшы ў Жыровічах — перадумаў.

„У сэмінарыю я прыехаў на пачатку ліпеня. Адразу пайшоў у храм, дзе зьдзівіўся, убачыўшы ўніяцкія абразы. Увогуле, усе храмы там пабудаваныя ўніятамі. Прайшоўся па манастыры. Са мной быў сэмінарыст зь Берасьця. Спытаў яго, як ён пачуваецца ў Жыровіцкім кляштары? Ён пацьвердзіў пачуцьцё прыгнечанасьці. Кажа: „Расея праводзіла захопніцкую палітыку, а расхлёбваюць яе беларусы... Молішся ў гэтых сьценах і адчуваеш раздвоенасьць”.

Зайшлі ў манастырскі корпус, у брацкія пакоі. Мне стала млосна ад гніласнага паху. У кельлях — смурод яшчэ большы: ад сырасьці, бруду, гнілой бялізны.

Як патлумачыў мой спадарожнік, з манастыра паслушнікі пэрыядычна ўцякаюць. Але, часам, змушана вяртаюцца, не знайшоўшы працы...

Заходзім у сэмінарыю. Вітаюся зь дзяжурным на беларускай мове. У таго твар — разгублены. „Тут гэтак не прынята, — адказвае мой знаёмца. — Данясе, будуць непрыемнасьці.”

Абед дрэнны. Побач кавярня, ідзём туды. Пытаюся, ці ёсьць стыпендыя? „Ёсьць, — кажа, — адзін даляр.”

— Як тады жывяце?

— Ды прывозяць зь вёскі сала, яйкі. Тут усё вырашаюць грошы: за грошы паступаюць, здаюць экзамены. Мы — як лялькі, як манекены для дзялкоў ад праваслаўя.

У сэмінарыі мяне выклікаў дзяжурны памочнік. Яго цікавіць: ці не нацыянальст я, ці не зьвязаны з БНФ. Такія, уяўляецца, тут непатрэбныя.

Я не лічу сябе нацыяналістам ці фанатыкам. Для мяне ідэал — незалежная Беларусь, дэмакратыя, Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. У 1944 годзе на тэрыторыі Беларусі яна была скасаваная, а яе сьвятары ці сталі таемнымі прыхільнікамі БАПЦ, ці зьніклі ў лягерах. Паводле словаў майго дзеда, таемныя сьвятары БАПЦ былі пад расейшчынай да канца 50-х гг., паколькі храмы БАПЦ апынуліся ў руках маскоўскай патрыярхіі, а супраціў гэтаму захопу выклікаў рэпрэсіі.

Мае родныя наведвалі гэтыя храмы. Для мяне асабіста кіраўнік Беларускага праваслаўя — гэта мітрапаліт Мікалай, беларус з Моталя, перакладчык на беларускую мову *Служэбніка* і *Эвангельля*, выдатны прапаведнік, кожнае слова якога сьведчыць пра любоў да роднае зямлі.

Такога пра Філярэта (які раней быў у цесных стасунках з камуністычным рэжымам, а цяпер у такіх адносінах з рэжымам Лукашэнкі) я сказаць не магу.

Думаю, што БАПЦ адродзіцца. І я гатовы ў ёй служыць хоць сьпеваком, чытальнікам, калі спатрэбіцца — дык і экстэрнам здаць экзамены за курс сэмінарыі для пастырскага служэньня."

***(Паводле Беларускай рэдакцыі радыё „Свабода")***

## СТУКАЧЫ З АГП

Рэдакцыя смаргонскай газэты „*Сьветлы шлях*" атрымала ліст наступнага зьместу: „В 20-х числах декабря 2000 г. в почтовых ящиках города появилась листовка, разжигающая национальную рознь, под заглавием „Расейскіх акупантаў вон!" Данная листовка не имеет исходных данных, что противоречит положению о распространении информации и преследуется по закону. Содержание данной листовки выдержано в духе оголтелого национализма, весьма схожего с периодом 30-х годов „Великого рейха". Всех „деятелей", выступающих под названием „Беларускі Вызвольны Рух", мы рассматриваем как злонамеренных провокаторов, пытающихся посеять ненависть и злобу к оппозиции в республике накануне президентских выборов. К сожалению, часть населения рассматривает оппозицию как БНФ и связаного с ним Позняка, не зная того, что существует целый спектр оппозиционных партий, ничего общего не имеющих с партией, возглавляемой Позняком.

Председатель Совета городской организации ОГП Т. Картавик"*

* * *

*Пазнаеце стыль: „национольная рознь", „оголтелый национализм", „схожий с „Великим рейхом", „злонамеренные провокаторы" і г.д. (А гэтая „республика" з маленькай літары!) Колькі гадоў мы чуем усю гэтую тэрміналёгію з кагэбоўска-маскоўскай падваротні. Ня вытрымалі нэрвы ў агентуры.*

*Ведаем мы такія „партыі" і „целый спектор". Было ўжо такое ў гісторыі Беларусі ня раз. Як толькі зьнікалі зьнешнія рэсурсы — канчаліся і антыбеларускія (ці квазібеларускія) партыі. І штурхаць ня трэба было.*

---

* „У 20-х днях сьнежня 2000г. у паштовых скрынках горада зьявілася ўлётка, якая распальвае нацыянальныя адрозьненьні, пад загалоўкам „Расейскіх акупантаў вон!" Дадзеная лістоўка ня мае выходных дадзеных, што супярэчыць палажэньню пра распаўсюджаньне інфармацыі і перасьледуецца па закону. Зьмест дадзенай лістоўкі вытрыманы ў духу агалцелага нацыяналізму, даволі падобнага на пэрыяд 30-х гадоў „Вялікага рэйху". Усіх „дзеячоў", якія выступілі пад назвай „Беларускі Вызвольны Рух", мы разглядаем як зламысных правакатараў, што спрабуюць пасеяць нянавісьць і злобу да апазыцыі ў рэспубліцы напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў. На жаль, частка насельніцтва разглядае апазыцыю як БНФ і зьвязанага зь ім Пазьняка, ня ведаючы таго, што існуе цэлы спэктар апазыцыйных партыяў, якія нічога агульнага ня маюць з партыяй, якую ўзначальвае Пазьняк.
Старшыня Савету гарадзкой арганізацыі АГП Т. Картавік" (*з руск.*)

**ЗЯНОН ПАЗЬНЯК**
*(Ліст да беларусаў Вызвольнага Руху)*
*14 сьнежня 2000 г.*

## АСЬЦЕРАГАЙЦЕСЯ ЧАРЦЕЙ З ТАБАКЕРКІ!

Акупацыйныя ўлады на Беларусі рыхтуюцца да выбараў прэзыдэнта. Мы, беларусы, павінны ведаць, што яны зьбіраюцца рабіць і чым гэтае мерапрыемства можа павярнуцца для нас.

Спачатку — канстатацыя становішча. Маскоўскія спэцслужбы (КГБ-ФСБ) ужо фактычна цалкам захапілі ўладу ў Беларусі. За апошні час яны яе пашырылі, умацавалі і ажыцьцяўляюць практычна поўны кантроль над Лукашэнкам. У гэтых варунках Масква зацікаўленая ў выбарах прэзыдэнта, каб легалізаваць (легітымізаваць) сваю ўладу на Беларусі і стварыць праўнае абгрунтаваньне для акупацыі. Ёй патрэбны свой чалавек на прэзыдэнцкай пасадзе.

Прайграньне выбараў абазначала б для Масквы страту Беларусі, якую яна ўжо амаль захапіла. Для Лукашэнкі — суд і трывожную невядомасьць. Для Лукашэнкі захаваньне ўлады ёсьць пытаньнем жыцьця, лёсу і асабістай свабоды.

Улічым, што выбары будуць адбывацца ў рэжыме акупацыйнай дыктатуры, пры адсутнасьці дэмакратычных умоваў і ў становішчы, калі большасьць людзей (больш, чым дзьве трацыны) не падтрымлівае Лукашэнку.

Ня цяжка зразумець, якія ў такіх абставінах плянуюцца „выбары" і як яны будуць праводзіцца ўладамі. Дзеля таго, каб утрымаць пасаду прэзыдэнта і ўмацаваць акупацыйны рэжым, пойдуць на ўсё. Нармальных выбараў ня будзе. (Праўда, „хаджэньне на ўсё" яшчэ не гарантуе перамогі, але пра гэта — іншым разам.)

Мэтады, якімі будуць карыстацца на выбарах гэбісты і цяперашняя ўлада на Беларусі, — вядомыя: прымус, прафанацыя, фальсіфікацыя і ашуканства выбаршчыкаў.

Спынімся на самым небясьпечным — на ашуканстве выбаршчыкаў. Гэтая справа цалкам ў руках КГБ-ФСБ. Мэтодыка яе лёгка ідэнтыфікуецца. Але змагацца з ашуканствам надзвычай цяжка, бо яно заснаванае на масавых маніпуляцыях інфармацыяй і на псыхалягічным эфэкце падрыхтаванай нечаканасьці. (Назавём умоўна гэтакі прыём — „чорт з табакеркі".)

Фундамэнтальнай падставай і абавязковай умовай такой мэтодыкі павінен быць поўны кантроль спэцслужбаў над кандыдатам улады і над яго супернікам. У больш шырокім сэнсе — павінен ажыцьцяўляцца абавязковы кантроль над уладай і над апазыцыяй да яе. Апазыцыю стараюцца інфільтраваць агентурай, разваліць і ўзяць у свае рукі. Калі не атрымліваецца — ствараюць сваю, паралельную апазыцыю і робяць яе інфармацыйную „раскрутку". (Тое ж адносіцца і да сродкаў масавай інфармацыі.)

Гэтую схему руская разьведка на Беларусі пачала ўжываць з 1992 года, неўзабаве пасьля дасягненьня незалежнасьці і пасьля таго, як Народны Фронт, сабраўшы амаль паўмільёна подпісаў, паставіў пытаньне на рэфэрэндум аб выбарах новага парляманту.

Тады супраць БНФ хутка пачалі ствараць паралельны „рух" — „народное движение Белоруссии" (НДБ). На чале яго паставілі падпалкоўніка Гайдукевіча. Праз падстаўную арганізацыю ("Комитет солдатских матерей") урад Кебіча выдзеліў на падтрымку „руху" велізарныя сродкі. Для кіраваньня „рухам" ва Ўрадзе была створаная спэцыяльная структура з функцыянэраў КГБ, куды залічылі на пасаду спадара Гайдукевіча, генэрала Паўлава і інш. Урад Кебіча аб'яўляе пра плян аб'яднаньня грашовых сістэмаў Беларусі і Расеі (гэта значыць — паглынаньне Беларусі Расеяй). Масква горача падтрымлівае Кебіча (пацалункі з Чарнамырдзіным). Улада поўным ходам ідзе да прэзыдэнцкіх выбараў, хоць шансы Кебіча выйграць у прадстаўніка БНФ былі дастаткова сумніўнымі. Дзейнасьць Кебіча на працягу доўгага часу жорстка крытыкавалася Фронтам і ў друку (Апазыцыяй БНФ у Вярхоўным Савеце, газэтай „Свабода" і інш.). Кебіч ня меў даверу.

І тут... выскоквае чорт з табакеркі (нікому невядомы Лукашэнка) і накідваецца на „злодзея Кебіча". Лукашэнку неабмежавана прапануюць эфір, тэлебачаньне і радыё, сродкі масавай інфармацыі, каманды функцыянэраў і журналістаў. Гучыць бравурная крытыка. За кароткі час „выхадзец з табакеркі" стаў вядомы ўсім савецкім (і постсавецкім) выбаршчыкам. На яго працуе сістэма сацыяльнай дэзынфармацыі (Аддзел КГБ па распаўсюджваньні чутак) і цэлая каманда. Жыхар з табакеркі хутка становіцца электаральным выбранцам і сацыяльным героем. Пры гэтым Масква і КГБ адначасна падтрымліваюць і Кебіча, і

Лукашэнку. Выбар паміж імі быў зроблены ў час выбарчай кампаніі. Канчатковы — пасьля другога туру, у які, ізноў жа, вывелі Кебіча і Лукашэнку (хаця на справе Кебіч у другі тур не праходзіў).

Аналягічную схему гэбісты ажыцьцявілі ў Расеі. Тут з табакеркі выскачыў нікому не вядомы Пуцін. Толькі электаральным героем ён зрабіўся не на ўяўнай барацьбе з карупцыяй, як Лукашэнка, а на вайне і інспірацыі нянавісьці да чачэнцаў.

Пасьля лістападаўскага перавароту ў 1996 годзе містыфікацыі і злавесныя інспірацыі становяцца любімым палітычным прыёмам расейскіх спэцслужбаў на Беларусі. (Як кажуць, „вышлі ўсе мы з-пад Лёзна".)

У 1999 годзе „з табакеркі" нечакана для многіх выскоквае спадар Чыгір, пра якога ўжо амаль забыліся, бо ішла ўзмоцненая прапаганда асобы Генадзя Карпенкі. (Што потым зрабілі з Карпенкам — вядома.)

Нагадаю, што галоўная мэта праекту „Чыгір" (выбары прэзыдэнта) — зьнішчыць Беларускі Народны Фронт. Гэта была самая небясьпечная атака на Фронт за ўсю яго гісторыю. І Чыгір з Ганчаром ведалі, на што ішлі.

У пачатку сьнежня 1999 года заключаюць чарговы пакт Лукашэнкі-Ельцына аб „саюзе" Беларусі з Расеяй. Прагназавалі грамадзкае напружаньне — і з табакеркі выпускаюць „гаспажу" Віньнікаву, якая нібы та зьнікла 9 месяцаў таму пры таемных абставінах. І вось — „сэнсацыя": Віньнікава зьяўляецца. (Ай-я-яй, а Лукашэнку нават у забойцы запісвалі.)

Пасьля таго, як ФСБ вывезла Віньнікаву з-пад арышту ў Лёндан, — задача ў іх простая: трымаць сьведку лукашэнкавых фінансавых таямніц на моцнай шворцы, бліжэй каля сябе і далей ад сярдзітага дыктатара. Зразумела, дзеля чаго. (Пры гэтым „гаспажа", трэба думаць, зусім ня лічыць, што яе завербавалі.)

Віньнікаву выпускаюць час ад часу на паверхню ў якасьці „інфармацыйнай пустышкі", дзеля адцягненьня ўвагі грамадзтва ад чарговых інтэграцыйных атак на Беларусь. (З усяго, што нагаварыла словаахвотлівая банкірка „ў палітычных інтэрв'ю", няма нічога канкрэтнага і ніякай рэальнай інфармацыі.)

Ня буду пералічваць больш дробныя выпадкі параноўных містыфікацыяў. Трэба толькі ўсьведамляць, што ў гэтым выяўляецца характэрная адметнасьць апэратыўна-палітычнай дзейнасьці ГПУ-НКВД-КГБ-ФСБ і г.д. Такія паводзіны ў палітыцы ўвогуле характэрныя для спэцслужбаў. Пры аналізе становішча ў нашай краіне, дзе ўладу кантралюе разьведка чужой дзяржавы, нельга ня ўлічваць гэтае выпрабаванае інтрыганства і маніпуляцыю людзьмі.

Набліжаюцца выбары — пара адчыняць табакерку.

Год таму я паведамляў у польскім друку пра містыфікацыю са зьнікненьнем Віктара Ганчара. Але ў Польшчы дрэнна разумеюць ненармальныя рэчы. (Зрэшты, і ў Беларусі таксама.) Тым ня менш час ідзе — пара на выхад. Вярнуўся ж на службу Д. Булахаў.

Як выпусьцяць на сцэну Ганчара ці Булахава, ці каго іншага, у якім выглядзе, на якім кані і ці выпусьцяць увогуле — пытаньні ня толькі рэжысёрскага густу, але й палітычнай мэтазгоднасьці. Ня выключана, што галоўныя дырыжоры зноў захочуць паўтарыць сітуацыю, як у 1994 годзе з Лукашэнкам ды Кебічам. Толькі цяпер роля Кебіча прызначана будзе Лукашэнку, а роля Лукашэнкі — выхадцу з табакеркі. Ролю для народа таксама напішуць: наступаць на граблі. Роля для Беларусі — залежнасьць ад Масквы і страта дзяржаўнай незалежнасьці.

Шмат якія беларускія палітыкі ніяк ня могуць зразумець, што з Масквой нельга гуляць. Зь ёй нельга бавіцца. Зь ёй трэба толькі змагацца. Пры тым — адкрыта. Трэба прымушаць сілы цемры паказвацца ў дзённым сьвятле.

Сітуацыя, безумоўна, можа ўзьнікнуць дрэнная. Масква здольная зноў павесьці ашуканых беларусаў усьлед за героем з табакеркі змагацца „за демократию" у пашчу ўдава. Але ўсё ж такі шмат хто зь беларусаў ужо набыў іншы вопыт, чым меў яго ў 1994 годзе, і ўжо ня дасьць сябе ашукаць. Акрамя таго, я ўспамінаю 1999 год, калі тандэм Чыгір-Ганчар з помпай, пыхай і траскатнёй ажыцьцяўлялі праект нібы та „выбараў прэзыдэнта". І што ж? Не дапамагла ні Масква, ні маскоўскія грошы, ні СМІ, ні юрыдычная адукацыя. На ўсялякіх мудрацоў хапае прастаты.

***У Беларусі ёсьць толькі адна арганізаваная апазыцыйная сіла, якая выяўляе сапраўдныя нацыянальныя інтарэсы беларускага народа. Гэтая сіла — Беларускі Вызвольны Рух, куды ўваходзяць Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне", Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ і іншыя арганізацыі.***

Вакол Беларускага Вызвольнага Руху і трэба гуртавацца беларусам, якім дарагая Беларусь, свабода і незалежнасьць Бацькаўшчыны.

# ЯДНАЙМАСЯ Ў ВЫЗВОЛЬНЫ РУХ!

*(Зварот)*

Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ заяўляюць, што ў акупацыйных абставінах, якія ўсталяваныя на Беларусі спадаром Лукашэнкам і расейскімі спэцслужбамі, Беларускі Вызвольны Рух і яго галоўныя арганізацыі (Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ) ёсьць адзінай рэальнай змагарнай сілай, якая аддана стаіць за Беларускі Народ, выяўляе інтарэсы Беларускага Народу і спаўняе патрэбы Беларускай Нацыі.

Мы разумеем складанасьць барацьбы і адчуваем адказнасьць перад Беларускім Народам, якая кладзецца на нашыя плечы. Мы ўлічваем усе магчымасьці змаганьня за Беларусь, у тым ліку — падрыхтоўку адзінага кандыдата ў Прэзыдэнты ад Беларускага Вызвольнага Руху (а фактычна — ад Беларусі). Наш беларускі кандыдат вызначаны. Ён будзе змагацца за інтарэсы Беларусі і яе людзей, супраць расейскай імпэрскай палітыкі, супраць прарасейскага рэжыму і яго прадажнай так званай „аб'яднанай апазыцыі", супраць усіх непрыяцеляў, зламысьнікаў і здраднікаў Беларускай Незалежнасьці.

Мы заклікаем усіх беларусаў згуртавацца вакол Беларускага Вызвольнага Руху. Гэта Рух, які выяўляе надзеі Беларускага Народа.

Беларусы, будзьма салідарныя. Не змарнуйма наш палітычны шанс. Мы былі, ёсьць і будзем гаспадарамі на нашай вольнай сьвятой Беларускай Зямлі.

***Прынята Соймам Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Соймам Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***
***9 сьнежня 2000 г., Менск***

# ПАМЯЦІ ВАСІЛЯ КУЗЬМІЧА

Трагічны лёс беларуса *Васіля Кузьміча.* Будучы выдатным спэцыялістам па радыёэлектроніцы, ён паехаў працаваць на Тайвань па кантракту з расейскай фірмай. Працуючы там, выпадкова атруціўся хімічным рэчывам. Ніхто з рускіх, якія былі зь ім, не парупіўся яго ўратаваць і выклікаць своечасова хуткую мэдычную дапамогу. Наадварот, яны дзейнічалі насуперак чалавечаму абавязку. Калі Васіля адвезьлі ў шпіталь, было ўжо позна. 7-га студзеня ён памёр.

Мы ведалі яго. Гэта быў чалавек велікадушны, таленавіты і вельмі сьціплы. Гэта тыя якасьці асобы, якія вылучаюць беларуса ў сьвеце і сьведчаць пра яго вышыню. Шкода, што ўжо не жыве сярод нас Васіль Кузьміч, і беларускі народ паменеў на аднаго добрага чалавека. Вечная памяць.

Выказваем нашае жалобнае спачуваньне яго сям'і: *сыну Антону, дачцы Вользе і жонцы Вользе Аляксандраўне Кузьміч, вядомай Заслужанай настаўніцы Беларусі, дэпутату Менскага гарсавета XXI скліканьня.*

Неяк трэба гэта ўсё перажыць у асірацелай сям'і. Хай жа Бог дапаможа ёй у горы спагадай і падтрымкай ад добрых людзей.

***Зянон і Галіна ПАЗЬНЯК***

* * *

Мы ведаем шмат выпадкаў ашуканства, калецтва і сьмерці беларусаў, якія заключалі кантракты з расейскімі фірмамі ці, тым горш, — ехалі на заробкі ў Расею. Нядаўна шмат пісалася, як ашукалі групу беларускіх будаўнікоў, што паехалі па расейскім кантракце працаваць у Якуцію. Добра, што хоць жывымі вярнуліся.

З расейцамі небясьпечна супрацоўнічаць, бо ў Расеі поўна крымінальных людзей, і крымінальнае думаньне шырока распаўсюджана.

Васіль Кузьміч заключыў кантракт зь нейкай расейскай фірмай пад назвай „Сталіс". Калі Васіль памёр у тайваньскім шпіталі, гэтая фірма адмовілася плаціць за яго лячэньне. Кітайцы пачалі патрабаваць ад Вольгі Аляксандраўны выплаціць ім каля 10 тычячаў даляраў за тое, што Васіль памёр ў іхным шпіталі. Самая вінаватая ва ўсім аказалася сям'я і жонка Васіля, якая ня можа заплаціць грошы лекарам, што ня вылечылі яе мужа.

Гэты празаходні тупізм зь яго кастай рэкеціраў Гіпакрата нам добра вядомы. Але мяне ўразіла іншае. Беларуская журналістка з радыё тэлефануе ў тую расейскую фірму і размаўляе з галоўным бухгалтарам арганізацыі (яна ж — жонка прэзыдэнта фірмы). І тут я ўспомніў Расею...

„Товарищ поехал по собственной инициативе, — чуецца ледзяны, хамскі, злосны пранонс. Ні табе спачуваньня, ні культуры. Ніякага паняцьця, як сябе паводзіць у такой сітуацыі, — отвечать за это он должен сам", — гучыць далей афіцыйная асоба.

Мне гэтага хапіла.

І як гэта Васіль Кузьміч згадзіўся паехаць з такімі ў бельсьвет... Відаць, гэта быў злы лёс. І каб ён наканаваўся, патрэбна было, каб вакол Васіля сабралася зло.

„Калі ён езьдзіў з нашымі беларускімі фірмамі, — кажа Вальга Аляксандраўна на радыё, — то ніколі ніякіх парушэньняў ні з боку кітайскага, ні з боку беларускага ў адносінах да тэхнікі бясьпекі не было. Расейскія кампаніі ніякай дапамогі не аказалі. Яны рабілі маральны ціск на нас."

Дзякуй Богу, супрацоўнікі беларускага МЗС узяліся шчыра і па-чалавечаму за гэтую справу. Дарадца консульскай управы МЗС *Аляксандар Слабадчук* кажа: „Гэта быў беларускі грамадзянін, і мы будзем за яго інтарэсы змагацца. І амбасада Беларусі ў Кітаі, і консульская служба цалкам сканцэнтравалі сваю працу на гэтай экстрымальнай сітуацыі."

Па-грамадзянску і па-людзку аднёсься да гэтага няшчаснага выпадку намесьнік Міністра замежных справаў Беларусі *Аляксандар Герасіменка*, каб дапамагчы Васілю Кузьмічу завяршыць свой апошні шлях здалёку ў зямлю Беларусі.

***Мар'ян ВАНЬКЕВІЧ***

## ЦЕРЛЮКЕВІЧ ВЕРА МАКСІМАЎНА

*(1941 — 31.12.2000)*

*31 сьнежня 2000 г.* пасьля доўгай хваробы памерла *Вера Максімаўна Церлюкевіч*, сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, актыўны ўдзельнік *Беларускага Вызвольнага Руху.*

Абвостранае пачуцьцё справядлівасьці, шчырая любоў да Бацькаўшчыны — такімі былі галоўныя рысы асобы Веры Максімаўны. Такой запомняць яе тысячы людзей, якія ведалі яе як бясстрашнага барацьбіта за Беларусь. Простая беларуская жанчына, рабочая, яна глыбока перажывала за лёс нашай краіны, стала ў першыя шэрагі абаронцаў незалежнай Беларусі. Яе не зламалі ні рэпрэсіі, ні прыніжэньні з боку антынароднага рэжыму. Да апошняга дня яна захавала ў душы веру ў наш народ і шчасьлівую будучыню нашай дзяржавы.

Выказваем шчырыя спачуваньні яе сям'і. Сьветлая памяць!

***Кіраўніцтва Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***



***Вера Церлюкевіч ня так даўно.***

***В. М. Церлюкевіч*** нарадзілася ў 1941 г. у сялянскай сям'і ў вёсцы *Новы Барок Краснапольскага раёну на Магілёўшчыне* (вёску „ліквідавалі" пасьля Чарнобыльскай катастрофы, цяпер яе няма на мапах). 16-гадовая, яна прыехала ў Менск, скончыла прафэсійна-тэхнічную вучэльню. Працавала цяжка там, дзе не вытрымліваюць мужчыны. Доўгія гады працавала кранаўшчыцай ў ліцейным цэху трактарнага заводу. Тры гады працавала ў Манголіі, дзе беларусы дапамагалі будаваць мэталургічны камбінат. У першы ж дзень красавіцкіх страйкаў 1991 г. В.М.Церлюкевіч стала галоўным арганізатарам рабочага пратэсту на Трактарным. І потым ужо не пакідала ні на дзень *Беларускі Вызвольны Рух*. Яе шмат разоў арыштоўвалі і кідалі за краты, зьбівалі і прыніжалі міліцыянты, правакатары, амонаўцы. Не аднойчы падчас вулічных сутыкненьняў яна была ў самых небясьпечных месцах і выратоўвала фронтаўцаў, вырываючы людзей з амонаўскіх рук. Мы заўсёды бачылі яе зь *Бел-Чырвона-Белым Сьцягам* наперадзе. І не тады, калі „было дазволена" (тады ў галаву калёны „мужна" станавіліся былыя намэнклятуршчыкі ды іншыя мясцовыя каштуніцы), а якраз у самыя драматычныя моманты абароны незалежнасьці Беларусі. Яна была прыкладам мужнасьці для мужчын, і жанчынам паказвала, як трэба бараніць будучыню сваіх дзяцей.

Калі яна цяжка захварэла, сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* паклапаціліся, каб яна не пачувала сябе самотнай. Былі зь ёй да апошняга дня. 2-га студзеня сабралася вялікая грамада пад беларускімі сьцягамі, каб правесьці яе ў апошні шлях. І гучалі рэлігійныя і патрыятычныя сьпевы, людзі добрымі словамі ўспаміналі Веру Максімаўну. Пахавалі яе на Паўночных могілках сталіцы.*

***(Інфармацыйная камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

---

* Журналісты так званых „незалежных" СМІ, і асабліва радыё „Свабода", нават пра сьмерць Веры Цэрлюкевіч далі заведама неадпаведную інфармацыю.

# РАБУЮЦЬ АПОШНІ ЛЕС

Лясная гаспадарка — адна зь нямногіх вытворчасьцяў Беларусі, дзе можна зарабляць валюту. Гэтым карыстаюцца набліжаныя да ўлады структуры. Зьнішчэньне каштоўных пародаў дрэваў стала некантраляваным варварствам. Найбольш шпаркімі тэмпамі ідзе высяканьне старых ды дарагіх дрэваў (бук, канадыйская елка, дуб). Высякаюць іх цалкам драпежным спосабам, бо ніякага аднаўленьня зьнішчанага ляснога фонду не адбываецца, а часам адразу на месцы высяканьня проста ў лесе распачынаюць перапрацоўку драўніны. Прыкладам, у *Бярэзінскім запаведніку* наладжаная вытворчасьць паркету, а ў *Белавежскай Пушчы* працуе некалькі стацыянарных лесапілак.

З незалежнага расьследваньня, якое правёў журналіст ***Сяргей Пульша***, стала вядома, што ў *Прыпяцкім запаведніку* ў сакавіку мінулага году адчынілі цэх па перапрацоўцы дубу. С.Пульша: „Гэта, пэўна, самы ўнікальны завод у Беларусі хаця б таму, што на яго будаўніцтва быў атрыманы крэдыт (2 мільёны 796 тысячаў 400 даляраў). Хутчэй за ўсё, крэдыт быў атрыманы ад Сусьветнага банку разьвіцьця на прыродаахоўчую дзейнасьць.

Дрэвы вырубаюцца менавіта ў запаведніку і ўсё гэта ідзе на экспарт у Нідэрлянды. Сума кантракту на пастаўку дрэва — 30 тысячаў кубічных мэтраў па 100 даляраў за куб. мэтар. На 6 мільёнаў 230 тысячаў дойч марак — у Чэшскую рэспубліку. Ёсьць кантракты ў Нідэрлянды на 2 мільёны 250 тысячаў дойч марак.

Хто канкрэтна займаецца нарыхтоўкай ды вывазам драўніны, часта ня ведаюць нават лясьнічыя. Дзейнічае „тэлефоннае права". Усялякія спробы высьтветліць, адкуль што пачынаецца, скончваюцца спасылкай на нейкага высокага чыноўніка. Інфармацыя пра загадкавыя структуры на тэрыторыі запаведнікаў ды заказьнікаў упарта хаваецца.

Кіраўнік Беларускай экалягічнай партыі зялёных Міхаіл Фрыдлянд кажа: „Мы таксама спрабуем гэтым заняцца, але вакол адна таямніца. Вядома толькі, што пад выглядам „санітарнага" высяканьня зьнішчаюць дубы ды іншыя каштоўныя пароды дрэваў. У 95-м г. загадам Ціцянкова спрабавалі наладзіць гандль дубовай драўнінай з Фінляндыяй, але калі мы націснулі, Фінляндыя адмовілася ад сумніўнага супрацоўніцтва. Амаль усе „апэрацыі" праходзяць з санкцыі Беларускага фонду запаведнікаў, дзе да нядаўнага часу быў кіраўніком Ціцянкоў. Так многія прыходзяць, скардзяцца на анархію ў запаведніках, але ніякіх дакумантаў няма. Пасьля таго, як не адбылася ўгода з Фінляндыяй, увогуле ўся праца вядзецца напаўлегальна."

Сёньня ў Беларусі кантроль за выкарыстаньнем лясных багацьцяў амаль немагчымы. Міністэрства аховы прыроды і прыродных рэсурсаў згубіла прэрэгатыву кантролю на запаведных тэрыторыях.

Кіраўнік інфармацыйнага аддзелу Міністэрства Ніна Грыневіч паведаміла: „Мы цяпер не распараджаемся запаведнікамі. Усе запаведнікі перайшлі пад кантроль Упраўленьня справамі прэзыдэнцкай адміністрацыі. Што тычыцца выпадкаў злоўжываньня на тэрыторыях запаведнікаў, то яны былі, я гэта ведаю. Ці маюць яны месца сёньня — сказаць з упэўненасьцю не магу, бо зараз мы трохі іншае структурнае падразьдзяленьне."

Вось так рабуецца ўжо каторы год запаведнае і апошняе багацьце Беларусі. А пачыналі яшчэ расейцы-бальшавікі. Нават дзіўна, што нешта засталося яшчэ абабраць.

***(Паводле радыё „Свабода". І. Карней)***

# „КУЛЯ Ў ГАЛАВЕ"

## *Калыска свабоды*

„Могила Ленина — колыбель свободы всего человечества." *

*(Адзін з заклікаў ВКПб у дні пахаваньня У.Леніна)*

## *„Мысьлі" „аб'яднанай апазыцыі"*

„Вопрос нашего времени: нужно ли менять власть в Беларуси?" **

*(Газэта „Рабочы" , — 2000, спэцвыпуск)*

* * *

„Задача номер один сегодня — вернуть белорусскому парламенту полноценные функции" ***

*(Павел Данейка, „Рабочы", — 2000, спэцвыпуск)*

* * *

„У нас в ОГП, например, сейчас готовятся программы по выводу из кризиса каждого(!) региона Беларуси. Их разрабатывают специалисты, признанные во всем мире, — такие, как, например, зампредседателя партии Ярослав Романчук, которого сейчас пригласили в Таиланд читать лекции по экономике. Таиланд интересуется опытом белорусских ученых." ****

*(Анатоль Лябедзька. „Рабочы", — 2000, спэцвыпуск)*

* * *

„Мы понимаем, что в наших руках судьба Беларуси." *****

*(М. Чыгір. „Народная Воля", — 2001, 18.01)*

* * *

„Наша партия никогда не говорила о смене власти. Мы говорим о другом — о необходимости менять политику власти." ******

*(Валянціна Палевікова. „Рабочы", — 2000, спэцвыпуск)*

* * *

„Беларуская апазыцыя — ня збор балбатуноў-абібокаў."

*(Юры Хадыка. „Рабочы", — 2000, спэцвыпуск)*

---

* „Магіла Леніна — калыска свабоды ўсяго чалавецтва." *(з руск.)*

** „Пытаньне нашага часу: ці трэба зьмяняць уладу ў Беларусі?" *(з руск.)*

*** „Задача нумар адзін сёньня — вярнуць беларускаму парляманту паўнавартасныя функцыі" *(з руск.)*

**** „У нас, у АГП, напрыклад, зараз рыхтуюцца праграмы па вываду з крызісу кожнага (!) рэгіёна Беларусі. Іх распрацоўваюць спэцыялісты, прызнаныя ва ўсім сьвеце, — такія, як, напыклад, намстаршыні партыі Яраслаў Раманчук, якога зараз запрасілі ў Тайланд чытаць лекцыі па эканоміцы. Тайланд цікавіцца вопытам беларускіх вучоных." *(з руск.)*

***** „Мы разумеем, што ў нашых руках лёс Беларусі" *(з руск.)*

****** „Наша партыя ніколі не гаварыла пра зьмену ўлады. Мы кажам пра іншае — пра неабходнасьць зьмяняць палітыку ўлады". *(з руск.)*

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(паводле „Народнай Волі", „Нашай Свабоды", SANA, „БДГ", радыё „Свабода"; верасень, кастрычнік, лістапад 2000г.)*

■ *Пасьля сфальшаваных* лукашысцкіх „выбараў" Старшыня Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, Выканаўца функцыяў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ***С.Шарэцкі*** выступіў з заявай да беларускага народу і міжнароднай супольнасьці. У заяве гаворыцца: „Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь як адзіны легітымны заканадаўчы і вышэйшы прадстаўнічы ў краіне ворган, што зноў

пацьвердзілі прадстаўнікі міжнародных арганізацыяў, павінен неадкладна прыступіць да фармаваньня Часовага ўраду нацыянальнага даверу, які б замяніў збанкрутаваную групу асобаў, што незаконна ўтрымлівае ўладу і працуе на ліквідацыю незалежнасьці Беларусі, і разам зь Вярхоўным саветам Рэспублікі Беларусь арганізаваў бы сапраўды свабодныя, дэмакратычныя выбары як парлямента, так і прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. Са свайго боку я як Старшыня Вярхоўнага савету гатовы, згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, узяць на сябе ўсю адказнасьць і прыступіць на гэты конт да перамоваў з усімі зацікаўленымі сіламі ў захаваньні незалежнасьці Беларусі і вяртаньня яе на дэмакратычны шлях разьвіцьця."

■ *Беларускія дыпляматычныя прадстаўніцтвы* за мяжой даўно склалі сьпісы лаяльных цяперашняй ўладзе „сяброў Беларусі". Менавіта ім належала сыграць адпаведную ролю ў спэктаклі пад назвай „Дэмакратычныя выбары". Яны павінны былі сваімі незьлічонымі інтэрвью дзяржаўным беларускім СМІ пераканаць усіх у тым, што выбары прайшлі пад самым высокім міжнародным кантролем. Улады з дапамогай гэтых „варагаў" разьлічвалі зьнівэляваць нэгатыўнае ўражаньне, якое непазьбежна павінна было ўзьнікнуць пасьля выбараў. Заманьвалі іх сюды па-рознаму. Адным нагадвалі пра іхнае пралетарска-камуннае мінулае. І верныя ленінцы, а зь імі і рупліўцы славянскага братэрства з Балгарыі, Чэхіі, Летувы, Украіны ды іншых краінаў, памкнуліся ў „Савецкую Беларусь". Сярод іншых былі, напрыклад, прадстаўнікі Брытанскай Гэльсінскай групы. Нагадаю, што менавіта гэтая група крытыкавала высновы АБСЭ па выбарах у Альбаніі і Славаччыне, дзе ў свой час выбаршчыкі дэмантавалі нэакамуністычныя рэжымы. Гэтая група была адзінай міжнароднай арганізацыяй, якая прыслала назіральнікаў на так званы рэфэрэндум у Беларусі ў лістападзе 1996 г. „Іхныя погляды вельмі разбуральныя, і яны дазваляюць дыктатарам пакарыстацца сабой," — заявіў старшыня Міжнароднай Гэльсінскай фэдэрацыі Эрвін Роўдс. Трэція, як, напрыклад, бэльгійскія парлямантарыі, самы прызналіся, што яны прыехалі ў статусе „паміж турыстамі і міжнароднымі назіральнікамі". Як прызнаўся дэпутат Патрык Морыа, намесьнік старшыні Сацыялістычнай партыі Бэльгіі, іхная група не была афіцыйна накіраваная ў Беларусь нацыянальным парлямантам, а знаходзілася тут па сваёй ініцыятыве.

Асаблівую ўвагу афіцыйная прапаганда надала пасланцам Расейскай ДзяржДумы. Гэта была адзіная дэлегацыя, якая атрымала назіральныя паўнамоцтвы ад свайго парляманту. Да таго ж яны — „саюзныя браты". **Вячаслаў Ігруноў**, адзін з лідэраў фракцыі „Яблака", сказаў:"Я магу пагадзіцца, што стандарты, якія існуюць сёньня ў Беларусі, зусім непараўнальныя з тымі, што дзейнічаюць у Швэцыі альбо ў Вялікабрытаніі. А калі параўноўваць з Расеяй, то я хацеў бы, каб там праходзілі выбары хаця б напалову так арганізавана і дэмакратычна, як у Беларусі".

Эўрапейская праляманцкая „тройка" у складзе дзеючага старшыні Парляманцкай Асамблеі АБСЭ **Адрыяна Севярына**, дакладчыка Парляманцкай Асамблеі Эўропы **Вольфганга Бэрэндта** і прадстаўніка Эўрапарляманту **Яна Віерсмы**, якія знаходзіліся ў Беларусі падчас „выбараў" 15 кастрычніка, прадставілі справаздачу аб палітычнай сітуацыі ў Беларусі на прэс-канфэрэнцыі ў Менску. Яны абаперліся на высновы Місіі па тэхнічнай ацэнцы Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЭ, якая заявіла:"Выбары ў палату не адпавядалі міжнародным стандартам, якія прад'яўляюцца да дэмакратычных выбараў, а таксама патрабаваньням, сфармуляваным ў Капэнгагэнскім дакуманце АБСЭ 1990 г. Не былі выкананыя мінімальныя абавязацельствы па правядзеньні свабодных, справядлівых, роўных, падсправаздачных і адкрытых выбараў".

Масавымі грубымі парушэньнямі ў ходзе галасаваньня і вельмі малым працэнтам яўкі выбаршчыкаў былі адметныя „выбары" 15 кастрычніка. Паводле зьвестак актывістаў, якія вялі ўласны падлік наведвальнікаў выбарчых участкаў, сапраўдная яўка склала крыху больш за 40%, а па Менску — ня больш за 30%. Нават паводле зьвестак прызначанага Лукашэнкам кіраўніка ЦВК Л.Ярмошынай, яшчэ за некалькі гадзінаў да заканчэньня галасаваньня патрэбных 50% выбаршчыкаў не было. Але адразу пасьля заканчэньня часу галасаваньня была агучаная лічба ў 52%. І раптам праз некалькі гадзінаў лічба „у выніку апрацоўкі бюлетэняў" вырасла да 60%. Якім чынам такое стала магчыма, застаецца незразумелым, паколькі дадзеныя з раённых і абласных выбаркамаў мусілі паступіць да Ярмошынай адначасова. Так, у прыватнасьці, па падліках апазыцыі, па Магілеве прагаласавала 33%, у Віцебску столькі ж, у Салігорску і Наваполацку — 34-35%, а ў Менску ўвогуле крыху больш за 30%. Распаўсюджаным парушэньнем было паўсюднае хаджэньне па кватэрах з выбарчымі скрынямі без заяўкі выбаршчыкаў; скарачэньне сьпісу выбаршчыкаў; на многіх участках, прыкладна а 19-й гадзіне, калі стала бачна, што выбары правальваюцца, пачалі „удакладняць" сьпісы выбаршчыкаў, зь іх дзесяткамі і сотнямі „зьнікалі" людзі. На пытаньні асобаў, якія кантралявалі ход выбараў, члены выбаркамаў адказвалі: „Людзі з'яжджаюць, паміраюць..." Як быццам людзі паміралі сотнямі менавіта ў дзень галасаваньня. Многія ж, хто прыходзіў на ўчасткі, не знаходзілі свайго прозьвішча ў сьпісах выбаршчыкаў. Ва ўсю ішло галасаваньне па студэнцкіх пасьведчаньнях, якія не зьяўляюцца афіцыйнымі дакумантамі. Звыклае ўжо нелегальнае галасаваньне за сяброў ды родных адбывалася паўсюдна. І нарэшце, абсалютна неверагодная лічба тых, хто прагаласаваў датэрмінова — 15% па краіне, і 20% па Гарадзеншчыне. На многіх працуючых у дзяржаўных структурах і асабліва на студэнтаў, што жывуць у інтэрнатах, аказваўся ціск з пагрозамі, што „ужо назаўтра выкінуць з інтэрнату, калі ня пойдуць галасаваць". Такім чынам, відавочныя ўсе падставы для непрызнаньня выбараў сусьветнай супольнасьцю. Але Расея іх ужо прызнала, а сьпікер Дзярждумы камуніст **Г.Селязьнёў** выказаў упэўненасьць, што цяпер беларускую палату вернуць у эўрапейскія структуры.

■ *У Ружанскай пушчы*, што на Берасьцейшчыне, нанова адкрыты помнік паўстанцам 1863 году. Тады тут палегла каля 40 каліноўцаў. Нанова, бо помнік пастаўлены яшчэ ў 1930-я гг., а нядаўна быў спэцыяльна растраляны з самалёта падчас ваенных вучэньяў (непадалёк разьмешчаны палігон).

Ні ў каго не павінна выклікаць сумненьня, што ўяўляе сабой так званае „беларускае войска" пад акупацыяй.

■ Толькі 40% ад таго, што было заплянавана, змаглі пабудаваць сёлета магілеўскія будаўнікі. Прычым, нават у гарвыканкаме не адмаўляюць, што (разам з інфляцыяй і бюджэтным дэфіцытам) адна з галоўных прычынаў — будаўніцтва ў горадзе лядовага палацу, на які пайшло мора грошай і працоўных сілаў.

■ ***Колькі каштуе сяброўства з Расеяй?*** Беларусь штогод аказвае Расеі паслугі на суму 850 мільёнаў даляраў ЗША (заявіў Лукашэнка, выступаючы 12 кастрычніка перад дэпутатамі свайго псэўдапарляманту). Гэта — „базы, транзіт і іншыя паслугі". Яшчэ 200 мільёнаў даляраў ў год будзе каштаваць у будучым выкарыстаньне расейцамі будуемай пад Ганцавічамі станцыі папярэджаньня аб ракетным нападзе. „За Байканур Расея плоціць 200 мільёнаў даляраў штогод, а чым адрозьніваецца гэтая станцыя ад Байканура?"— сказаў Лукашэнка.

*(Растлумачым, чым. Байканур стаіць ў дзікім бязьлюдным стэпе, а Ганцавіцкая сьмерць — на галовах беларусаў.)*

■ Газэта *„Вашынгтон Таймс"* апублікавала ліст расейскага прэм'ера **Віктара Чарнамырдзіна** амэрыканскаму віцэ-прэзыдэнту **Альбэрту Гору** аб сакрэтнай дамоўленасьці, якая тычыцца супрацоўніцтва Расеі і Ірана ў ядзернай сфэры. Ліст датаваны 9 сьнежня 1995 г. Прэм'ер Чарнамырдзін просіць віцэ-прэзыдэнта не

раскрываць зьместу дамоўленасьці „для трэціх бакоў, у тым ліку для Кангрэсу ЗША”. Газэта зазначае, што пагадненьне з грыфам „сакрэтна” супярэчыць амэрыканскаму закону аб ядзерным нераспаўсюджваньні, які абавязвае адміністрацыю „поўнасьцю інфармаваць кангрэс аб усіх справах”, што маюць дачыненьне да ядзернай зброі.

■ *Жыхары Крычава* пачалі масава і ажыятажна зарабляць донарствам. На мясцовай станцыі пераліваньня крыві ўжо сабралася чарга каля 70 чалавек. Справа ў тым, што нядаўна здача крыві падаражэла і складае зараз ажно 7 тысячаў рублёў за 400 грамаў.

■ *21 кастрычніка* ўвечары ў Маскве група з некалькіх дзясяткаў брытагаловых напала на в’етнамцаў — жыхароў інтэрната. Скінхэды зьбілі „гасьцей сталіцы”. Ніякіх спробаў перашкодзіць фашыстоўскай расправе маскоўская міліцыя не рабіла. Але як толькі в’етнамцы паклікалі на дапамогу сваіх суайчыньнікаў, міліцыя „адразу ж узяла сітуацыю пад кантроль”. В’етнамцаў вярнулілі ў інтэрнат, а пагромшчыкаў пры гэтым не затрымалі.

■ *На Магілеўшчыне* за 5 гадоў амаль удвая паменеў прадпрымальніцкі сэктар. У 1995 г. Тут было 16 тысячаў прыватных прадрымальнікаў і 5 тысячаў прыватных фірмаў, сёлета — адпаведна 10 і 2,3 тысячы.

■ *Апошняе службовае сацыялягічнае дасьледваньне,* праведзенае беларускімі ўладамі, выклікала чарговы прыступ панікі ў адміністрацыі Лукашэнкі. 15 кастрычніка падчас галасаваньня ў першым туры „выбараў” дзяржаўныя сацыёлягі высьветлілі, што рэйтынг Лукашэнкі па ўсёй краіне ледзь-ледзь дасягае 22%. Апытаньне праводзілася пры ўдзеле КГБ Беларусі.Самы нізкі давер — у Менску і Берасьці (крыху больш за 10%). Тэрмінова распрацоўваюцца захады па папулярызацыі цяперашняе ўлады. Адсюль аднаўленыя доўгія маналёгі Лукашэнкі на БТ, якія, на думку ідэёлягаў, павінны выратаваць сітуацыю. І абяцанкі падвысіць заробак да 100 даляраў — з той самай опэры.

■ Плян будаўніцтва жыльля сёлета зноў не выконваецца. На кастрычнік будаўнікі здалі толькі 70% ад таго, што прадугледжвалася ўрадам.

■ *31 кастрычніка*. У Маскву часьцей сталі езьдзіць прадстаўнікі „аб’яднанай апазыцыі” зь Беларусі. З гэтай нагоды А.Лябедзька зазначыў, што „мы едзем у цэнтар, дзе рэальна прымаюцца рашэньні”. У тым ліку і па Беларусі. Трэба таксама адзначыць, што ў Лябедзькі ды ягоных калегаў па АГП усталёўваюцца кантакты і з прадстаўнікамі расейскага буйнога бізнэсу. Найвыгаднейшы спосаб бізнэсу цяпер — гандляваць Айчынай.

# JOIN THE LIBERATION MOVEMENT!

*(Appeal)*

*The Belarusan Popular Front “Adradzennie” and the Conservative Christian Party – BPF* state that in the conditions of occupation established by Lukashenka and the Russian special services the Belarusan Liberation Movement as well as its main organizations *(the Belarusan Popular Front “Adradzennie” and the Conservative Christian Party – BPF)* are the only really struggling forces which faithfully defend the Belarusan People, represents the Belarusan People’s interests and fulfils the Belarusan Nation’s needs.

We are aware of the complexity of the struggle and take up on our shoulders the responsibility for the Belarusan People. We consider all the possibilities of struggling for Belarus including the nomination of a common candidate of the Belarusan Liberation Movement (de facto of Belarus) to the presidential elections. Our Belarusan candidate is defined. He will struggle for the interests of Belarus and its people against the Russian imperialist politics, against pro-Russian regime and its venal so-called “united opposition”, against all the enemies, scoundrels and betrayers of Belarusan independence.

We call all the Belarusans to join the Belarusan Liberation Movement. This is the Movement, which express the hopes of the Belarusan People.

Belarusans, be solidary! Don’t loose our political chance. We have been, we are and we will be the masters in our independent holy Belarusan country.

*Adopted by the Soim of the Belarusan Popular Front “Adradzennie” and by the Soim of the Conservative Christian Party – BPF*

*9 December 2000*

***Zianon PAZNIAK***
***Chairman of the Belarusan Popular Front “Adradzennie” and of the Conservative Christian Party – BPF***

***Yury BELENKI***
***Acting chairman in Belarus of the Belarusan Popular Front “Adradzennie” and of the Conservative Christian Party – BPF***

***Anatol KRYVAROT***
***Executive secretary of the Uprava of the Belarusan Popular Front “Adradzennie” and of the Conservative Christian Party — BPF***




***THE HUMAN RIGHTS ARE NOT THE MAIN PRIORITY FOR THE BELARUSAN PEOPLE BUT THE INDEPENDENCE AND FREEDOM. BECAUSE „THE HUMAN RIGHTS” CANNOT EXIST UNDER THE OCCUPATION.***

Беларускія Ведамасьці
Беларускае выданьне
У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**